Камуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 16 1934 г. ПЯТНІЦА № 38 (4871)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ДЗІМІТРАЎ, ПАПОЎ І ТАНЕЎ ПРЫНЯТЫ Ў СОВЕЦКАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

З ПРЫЧЫНЫ АДМАЎЛЕННЯ БАЛГАРСКАГА ЎРАДА ЛІЧЫЦЬ АРЫШТАВАНЫХ У ГЕРМАНІІ т.т. ДЗІМІТРАВА, ТАНЕВА І ПАПОВА БАЛГАРСКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ, СВАЯКІ АПОШНІХ ЗВЯРНУЛІСЯ ПРАЗ БЕРЛІНСКАЕ ПАЎПРЭДСТВА ДА СОВЕЦКАГА ЎРАДА З ПРОСЬБАЙ АБ ПРЫНЯЦЦІ ІХ У СОВЕЦКАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА. СОВЕЦКІ ЎРАД ЗАДАВОЛІЎ ХАДАЙНІЦТВА АБ ПРЫНЯЦЦІ т.т. ДЗІМІТРАВА, ТАНЕВА І ПАПОВА Ў СОВЕЦКАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА.

АРГАНІЗАЦЫИНЫЯ ПЫТАННІ (ПАРТЫЙНАЕ І СОВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА)

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на XVII з'ездзе ВКП(б)

6 ЛЮТАГА 1934 ГОДА

Канец. Пачатак глядзі ў №№ 36 і 37

Масквічы і ленінградцы добра памятаюць гісторыю са спабжэннем Масквы і Ленінграда мясам. У сувязі з перабоямі ў спабжанні мясам Масквы, Ленінграда і Данбаса, тав. Сталін паставіў пытанне з усёй вострасцю. Былі праверены ўсе нашы рэсурсы і магчымасці, былі праверены кантрольныя цыфры жывёлагадоўлі ў рабочых. У рэзультаце прынятых мер, прымацаваўшы соўгасаў, звяўшы са спабжэння мёртвых душ і ўстанаўленні цвёрдых кантрольных лічбаў, працоўныя Масквы, Ленінграда і Данбаса бесперабойна спабжаюцца мясам па ўстаноўленых нормах.

Або ўзяць работу ЦК па шырспажыву. Калі Цэнтральны Камітэт стаў атрымліваць весткі аб тым, што тавары шырспажыву не даходзяць да вёскі, была выдзелена камісія, якая пад старшынствам тав. Сталіна канкрэтна і дасканальна разабралася ва ўсіх камбінацыях пазарыначных спажыўцоў, з'ядаўшых значную долю рыначных фондаў. Неабходна было перамагчы супраціўленне пазарыначных спажыўцоў, а вы ведаеце, што гэтыя пазарыначныя спажыўцы даволі шаноўныя. Неабходна было зрэзаць лішкі, якія яны атрымлівалі, і накіраваць гэта ў вёску і рабочыя раёны. Пасля прыняцця пастаноў, ЦК не раз правяраў іх выкананне. Пытанні шырспажыву былі пастаўлены на верасьнёўскім пленуме (1932 г.) у парадку справаздачы, і, нарэшце, у самы апошні час ЦК зноў праверыў выкананне пастаноў па шырсцяных тканінах.

Чыгуначным транспартам Палітбюро займаецца ўпчыльную ўжо не калькі год. Даволі нескомніць аб на радах, якія былі ў студзені 1931 года. У чэрвені 1931 года пытанні транспарта абмяркоўваліся на пленуме ЦК. У 1931 годзе на гэтых парадах былі машыністы, дырэктары, начальнікі раёнаў, начальнікі служб. ЦК уваходзіў ва ўсе карэнныя пытанні транспарта.

Апошняя пастанова Цэнтральнага Камітэта аб транспарце распрацоўвалася ў парадку канкрэтнага вывучэння кожнай дэталі. Нядаўна створана спецыяльная камісія ЦК і Саўнаркома па транспарту, якая павінна дапамагчы транспарт нікам палепшыць работу чыгунак.

Пасля той справаздачы крытыкі НКПШЗ, якая была на з'ездзе, гэта камісія, напаўна, разгорне сваю работу яшчэ больш грунтоўна. Яна будзе аператыўна кантраляваць, правяраць і дапамагаць ажыццяўленню пастаноў ЦК па транспарту.

Таварышы, працуючыя на мясцах, добра ведаюць аператыўную работу ЦК і асабіста тав. Сталіна па сельскай гаспадарцы. Яны ведаюць, як ЦК партыі з дня ў дзень правяраў пытанні сяўбы, уборкі і агульнага ўмацавання калгасаў. Правяраў не абстрактна. У гэтым годзе ЦК былі скліканы дзелавыя нарады з удзелам мясцовых работнікаў, на якіх былі разгледжаны ўсе практычныя пытанні, прыстасоўна да асобных раёнаў і абласцей. Вы ведаеце, як ЦК кіраваў сяўбой і як правяраў выкананне сваіх пастаноў. Ці дрэнна ідзе сяўба бавоўны, уборка бавоўны, праполка буракоў ці ўборка буракоў і т. д. ЦК правяраў з дня ў дзень і даваў практычныя ўказанні, як выправіць недахопы.

Або вось пытанне аб с.-г. машынах. Яно вылілася ў вялікае і вострае пытанне.

Вы памятаеце, што шмат гаварылі аб прапашным трактары, многа круцілі гэту справу ў апаратах, пакуль, нарэшце, у парадку праверкі выканання пытанне не было пастаўлена ў ЦК. Высветлілася, што справу завалакіцілі. Пасля высвятлення сістэмы трактара рашано было прыступіць к вытворчасці прапашнога трактара Фармола на Пупілаўскім заводзе.

Пытанні ўгнаенняў, угнаенняў для бавоўны, пытанні ўздыму ўраджайнасці ставіліся канкрэтна, прыстасоўна к кожнай вобласці. Калі-б Наркамзем, Наркамсоўгасаў і другія наркаматы ажыццявілі хоць-бы палову таго канкрэтнага і аператыўнага кіраўніцтва і праверкі выканання, якую ажыццяўляе ЦК, мы мелі-б наверняка яшчэ большыя дасягненні.

З праверкі выканання выцякаў рад буйных арганізацыйных пытанняў. **У гэтым і асаблівасць стылю работы Цэнтральнага Камітэта, стылю работы тав. Сталіна, што ўсе пастановы звязваліся непасрэдна са штодзённым аператыўным жыццём і з арганізацыйнымі пытаннямі. Увесь стыль і метад работы Цэнтральнага Камітэта — гэта адзінства слова і справы, адзінства рашэння і выканання.** Наша Палітбюро ЦК з'яўляецца органам аператыўнага кіраўніцтва ўсімі галінамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Амаль штодзённа тав. Сталін збірае дзелавыя нарады. Выклікае тых або іншых работнікаў у парадку аператыўнай пастаноўкі пытання, праверкі выканання, або вырашэння тых або іншых пытанняў, звязаных з запатрабаваннямі і патрэбамі месц. Многія пытанні, па якіх у другіх месцах працюць гадзінамі і прымаюць вялікія рэзалюцыі, вырашаюцца ў Цэнтральным Камітэце быстра і аператыўна.

Вы ведаеце, што калі сакратар райкома або абкома, старшыня выканкома прыйшоў у ЦК тэлеграму, то ён абавязкова атрымае праз 1-2 дні адказ. **(Апладысменты).**

ГАЛАСЫ. «Правільна».

КАГАНОВІЧ. Можна было-б прыведзці многа прыкладаў таго, як часта з невялікага, на першы погляд, пытання, з зрэстага паведамлення альбо пісьма вырастаюць вялікія і важныя гістарычныя рашэнні ва ўсіх галінах нашай дзейнасці. Давядуся т. Сталін, што ў адной школе кепска ідзе на вучэнне: дысцыпліны няма, настаўніка не шануюць, кепска пастаўлена справа навучання дзяцей. І вось з гэтага аднаго факта размат вяцца ўвесь вузел пытання аб школе, і прымаюцца тыя рашэнні аб школе, якія потым самі работнікі асветы, пастраўдзішняй называюць сапраўды гістарычнымі рашэннямі.

Альбо пытанне аб падручніках. Я не буду тут расказваць усю эпапею з падручнікамі.

СТАЛІН: Аб «рассыпным» падручніку.

КАГАНОВІЧ: Расказаць ці што?

ПОСТЫШЭЎ: Раскажы, а то тут крыўдзяцца.

КАГАНОВІЧ: Давядзецца ЦК, што ў дзіцячай няма падручнікаў. Выклікае т. Сталін і пытаецца, як стаіць справа з падручнікамі? Газбярыцеся. Затым па Палітбюро высветлілася, што ў нас пастаянных падручнікаў няма.

СТАЛІН: Кожны год падручнікі мяняліся.

КАГАНОВІЧ: Іменна кожны год падручнікі мяняліся. Мяняліся што год і праграмы. Лявалкія тэарэтыкі адмаўляны школ даказвалі, што калі мы замацуем падручнікі на некалькі год, гэта будзе цягнуць нас назад, а ў той-жа час не задужалі, што дзеці з-за адсутнасці падручнікаў малапісьменныя.

Назва «рассыпны» падручнік — гэта не злая зрэзкі, не жартаўлівая назва, а афіцыяльная наркамасветаўская назва гэтага роду «падручнікаў». Яшчэ ў 1930 г. усерасійская канферэнцыя па вучэбнай кнізе пастанавіла асноўнымі падручнікамі лічыць «краўны пад ручнік, ў прыватнасці ў форме рассыпных кніг, краявую газету — падручнік і агульнарэспубліканскі падручнік,—у прыватнасці ў форме рассыпных кніг».

«Рассыпны» падручнік сапраўды складаўся з паасобных лісткоў па ўсіх навуках разам, або, як гаварылі, «комплексна».

Не думайце, што лісткі гэтага «рассыпнога» падручніка давалі якія-небудзь сістэматычныя веды. Не, яны проста былі разрозненым справачным матэрыялам, г. зн. у адным лістку ў адну кучу мяшаліся і пытанні арыфметыкі, і родная мова, і весткі па геаграфіі, фізіцы, грамадскім навукам і т. п.

Вось і папрабуй вучань па падставе «рассыпных» вучэбных лісткоў мець у галаве стройныя сістэматызаваныя веды.

Кожны год Наркамасветы выпускаў велізарную колькасць падручнікаў. Трацілі працы, трацілі гібель паперы на «рассыпныя» падручнікі, і кожны год у нас не было стабільных падручнікаў.

Цяпер, пасля вырашэння пытання, узяліся за падручнікі, школа ў нас стала лепш. Гэта бясспрэчна. З падручнікамі яшчэ дрэна, але ўсё-такі ў гэтым годзе лепш.

БУБНОЎ: Усё-такі зрабілі тое-сёе ці не?

КАГАНОВІЧ: Так, тав. Бубноў, зрабілі пасля таго, як ЦК паставіў пытанне з усёй астратой і акуратна прасачыў за выкананнем сваёй пастановы.

СТАЛІН: Цяпер падручнікі стабільны.

КАГАНОВІЧ: Пытанняў, якія трэба вырашаць і выконваць, яшчэ многа, але работа Наркамасветы, безумоўна, палепшылася, пад ручнікі сталі стабільнымі.

Прывяду прыклад з найменш, здавалася-б, аператыўнай галіны — з галіны літаратуры. Што зрабіў тут ЦК?

Я маю на ўвазе пісторыю з РАПП'ам. Як вядома, група комуністаў-пісьменнікаў, карыстаючыся арганізацыйным інструментам РАПП'а, накіравільна скарыстоўвала сілу свайго комуністычнага ўплыву на літаратурным фронце і замест аб'яднання вакол РАПП'а і прыцягнення шырокіх пісьменніцкіх кадраў, гэта ўзначаўская група таварышоў тармазіла, затрымлівала разварот творчых пісьменніцкіх сіл. ЦК спатакаўся ў даным выпадку з неправільнай палітычнай лініяй групы комуністаў-пісьменнікаў на літаратурным фронце, прычым гэтыя таварышы мелі арганізацыйны апарат РАПП'а.

Можна было-б, вядома, вынесці вялікую рэзалюцыю аб задачах комуністаў у літаратуры, можна было-б прапанаваць рашаючым змяніць свой курс. Але гэта магло астацца добрым пажаданнем. Тав. Сталін паставіў пытанне паінтаму. Трэба, — гаворыў ён, — арганізацыйна змяніць становішча. І вось тады было пастаўлена пытанне аб ліквідацыі РАПП'а, аб стварэнні адзінага саюза пісьменнікаў. Пасля гэтага арганізацыйнага рашэння пытання пісьменніцкіх сіл падняліся, развіліся і справа ў літаратуры палепшаецца. Вырашэнне арганізацыйнага пытання было такім чынам забяспечана правільнае правядзенне лініі партыі ў літаратуры.

Я-б мог шамоскыць колькасць прыкладаў, паказваючых работу ЦК, але даволі і гэтага, каб атрымаць яснае ўяўленне аб ленінска-сталінскім стылі і метадзе работы ЦК.

Тав. Сталін вучыць нас кожны дзень уменню бачыць за формай змест, уменню падпарадкаваць арганізацыйныя формы, падбор і размеркаванне работнікаў сутнасці задач, уменню спалучаць агульную дырэктыву з канкрэтнымі задачамі, праверку выканання з асабістай адказнасцю, уменню быць патрабоўным да сябе і быць патрабоўным да другіх тав. дзе гэта датычыць справы, уменню памножыць сілы большэвікоў прыцягнем нем на свой бок найшырэйшых мас, у першую чаргу, беспартыйных актывістаў, рабочых, служачых і спецыялістаў, уменню арганізаваць работу так, каб не толькі самому працаваць, а прывесці ў рух усе вагары, прывесці ў рух усіх акружаючых цябе работнікаў, выхоўваючы іх для таго, каб з іх нарам выканаць тую задачу, якую на цябе ўскладаюць.

XVII з'езд партыі, як і ўся партыя ведае, што ўсё кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, яго Палітбюро і кіраўніцтва тав. Сталіна ёсць адзінае, непарыўнае пэлае, якое забяспечвае нам вялікія перамогі. **(Гром апладысментаў. Усе ўстаюць. Крыкі «ўра».**

Таварышы, мы прайшлі вялікія гады слаўнай барацьбы. Мы падводзім на XVII з'ездзе вынікі перамог не для ўпаення нашымі поспехамі, не для таго, каб пачыць на лаўрах. **Мы падводзім гэтыя вынікі, як армія байцоў-рэволюцыянераў. Мы аглядаемся на пройдзены шлях, каб на ўроках мінулага праверыць, адтачыць нашу зброю для надыходзячых яшчэ баёў.**

Мы абмяркоўваем тут арганізацыйнае пытанне. Арганізацыйнае пытанне і ёсць адточванне зброі. Важнасць яго, сур'ёзнасць яго вельга недаацэньваць. Бо нідзе ў свеце арганізацыйнае пытанне не стаяла і не можа стаяць з такой сур'ёзнасцю, з такой вострасцю, з якой стаіць яно ў нас, у краіне, якая будуе соцыялізм.

Арганізацыйныя тэзісы даюць напрамак нашай рабоце, яны вырашаюць асноўныя звенняныя пытанні. Пасля з'езда ўсе нашы арганізацыі, партыйныя і совецкія, павінны на практыцы прымяніць гэтыя асновы арганізацыйнай перабудовы.

XVII з'езд партыі прыняў справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта, як пастанову з'езда і партыйны закон, як праграму вялікіх соцыялістычных работ. З'езд паказаў гэтым бязмежнае давер'е к нашаму ленінскаму ЦК, к нашаму вялікаму правадыру, які згуртаваў мільёны працоўных нашай краіны і ўсяго свету.

Мы маем усе прадпасылкі, усё неабходнае для пераможнага ажыццяўлення баявой праграмы, прынятай з'ездам. Але калі мы маем моцную базу, моцны фундамент для пабудовы соцыялістычнага грамадства, калі ў нас усе ўмовы перамогі ў наяўнасці, ці азначае гэта, што задачы другой пяцігодкі будуць ажыццёўлены самацёкам, аўтаматычна. Ці азначае гэта хоць у якой-небудзь меры аслабленне ўвагі к задачам перамагання труднасцяй, к пытанням класавай барацьбы, к пытанням умацавання пролетарскай дыктатуры. Не, ні ў якой меры. Наадварот. тав. Сталін у сваім дакладзе з асаблівай яркасцю даказаў, што для поўнай ліквідацыі перажыткаў капіталізма, як у эканоміцы, так і ў свядомасці людзей больш за ўсё патрабуецца пільнасць, насцярожанасць, настойлівасць і класавая мабілізаванасць, з якой партыя прышла к XVII з'езду.

Мы маем буйныя поспехі ў справе асваення нашых заводаў, у справе большэвізацыі нашых калгасаў. Але мы не павінны закрываць вачэй на тое, што труднасцяй, недахопаў у нас многа, што вораг яшчэ капчаткова не разбіт. Мы не павінны закрываць вачэй на тое, што іменна на глебе супярэчнасцяй нашага росту немінуча могуць праяўляцца ўсякія рэцыдывы дробна-буржуазных, апартуністычных настрояў, усякага роду правыя і «левыя» адхіленні, з якімі партыя будзе і надалей змагацца з баявой рашучасцю і непрымірымасцю.

Тут выступалі і каяліся людзі, якія ўбачылі сваё падзенне, якія ўбачылі нашы перамогі. Гэта адлюстроўвае нашы перамогі. Мы не скажам, што мы з задавальненнем слухаем людзей, якія ўчора яшчэ аплёўвалі нашу партыю, узводзілі паклёп на кіраўніцтва нашай партыі і якія сёння прыходзяць і на каленях прызнаюць свае памылкі і просяць у партыі прабачэння. Але, таварышы, гэта нас супакоіць не можа і не павінна ўсыпляць. Рэцыдывы магчымы. Мы жывём у краіне, дзе соцыялізм канчаткова яшчэ не перамог. Мы жывём у акружэнні капіталістычных дзяржаў. Мы маем і будзем яшчэ мець труднасці, і мы можам сказаць тут усім і ўся—ня хай ведаюць, што большэвікі і XVII з'езд партыі ведаюць цану барацьбе за адзінства, якімі труднасцямі мы дабіліся адзінства партыі, і няхай ведаюць, што малейшая спроба фракцыйнасці, малейшая спроба парушыць адзінства сустрэне з боку партыі, з боку большэвікоў такі-ж сакрушальны адпор, як сустракалі ўсякія антыленінцы гэты адпор да гэтага часу. **(Бурныя апладысменты).**

Узброеная баявой праграмай, прынятай нашым вялікім з'ездам, партыя ідзе ўпэўнена і цвёрда сваім большэвіцкім шляхам, шляхам гераічнай барацьбы за большэвізацыю калгасаў, за тэхнічную рэканструкцыю, за заможнае жыццё працоўных мас, за асваенне новай тэхнікі, за выкарчоўванне бюракратызма і канцылярыцтвы, за большэвіцкую праверку выканання, за ідэйнае ўзбраенне сваіх радоў тэорыяй Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Захоўваючы ўсю мабілізаванасць, не дапускаючы ніякага зазнайства, самасупакоенасці і галавакружэння ад поспехаў, партыя будзе разбіваць астаткі класавага ворага, біць апартунізм, згуртоўваць новыя мільёны мас, падымаючы іх на новыя вялікія справы, змятаючы на сваім шляху ўсе перашкоды да соцыялізма, адкуль бы яны не выходзілі, звонку ці знутры.

Нашы перамогі з'явіліся рэзультатам таго, што на чале нашай партыі стаіць чалавек, які змог мабілізаваць масы з такой-жа рашучасцю і непахіснасцю, як і Ленін, адстаяць чыстату вучэння Маркса-Леніна, здолеў абагаціць гэта вучэнне, здолеў падняць высока сцяг барацьбы за соцыялізм, здолеў распазнаць агентуру класавага ворага ў нашай партыі, здолеў запаліць агнём энтузіязма партыю, рабочы клас і працоўнае сялянства і рушыць гэту вялікую армію працы на апошні штурм капіталізма ў нашай краіне, на пабудову пабеданоснага соцыялістычнага грамадства. (Бурныя доўгія апладысменты).

Наш з'езд прыкоўвае да сябе ўвагу мільёнаў, дзесяткаў мільёнаў мас не толькі нашай краіны, але і ўсяго свету. І наш XVII з'езд можа заявіць упэўнена гэтым мільёнам рабочых і сялян, што і ў далейшым, пад разгорнутымі сцягамі Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, маналітная, ідэйна згуртаваная, загартаваная і праверана ў баях за соцыялізм наша вялікая комуністычная партыя пад непасрэдным баявым кіраўніцтвам нашага першага вялікага арганізатара і настаўніка Сталіна павядзе мільёны да новых вялікіх перамог соцыялізма!

Няхай жыве наша вялікая комуністычная партыя!

Няхай жыве наш родны вялікі СТАЛІН!

(Гром апладысментаў. Крыкі «ура». Усе ўстаюць, пяюць «Інтэрнацыянал»).

Узброеная барацьба аўстрыйскага пролетарыята супроць фашызма

БАРЫКАДЫ Ў ВЕНЕ

БЕРЛІН, 14 лютага. (БЕЛТА).

Паведамленні венскіх карэспандэнтаў германскіх і швейцарскіх газет сведчаць, што ў Вене і ў правінцыі жорсткія баі прадаўжаюцца наперакор афіцыяльным запэўненням аўстрыйскага ўрада аб тым, што яму ўдалося «аўладаць становішчам».

Згодна паведамлення германскіх газет, у Флорадсдорфе (раён Вены) сёння несупынна адбываецца артылерыйская стральба, якой поўнасцю разбураны дзве вуліцы.

Супроць паўстаўшых рабочых пушчаны ў ход мінамёты. Вядзецца таксама артылерыйскі абстрэл раёнаў Оттакрынг, Зімерынг і Мейдлінг.

Урадавыя войскі падводзяць міны пад рабочыя дамы, пагражаючы ўзарваць іх, калі забарыкадаваўшыяся рабочыя не здадуцца. У раёне Гейлігенштадт прадаўжаюцца баі за дом імя Карла Маркса, які рабочыя ўпарта абараняюць ужо трэці дзень, не гледзячы на артылерыйскі абстрэл. У раёне Фаварытэн рабочыя буйнейшага хлебазавода Вены далучыліся да забастоўкі. Паліцыя захапіла завод і стараецца з дапамогай штрэйкбрэхераў забяспечыць выпечку хлеба.

Згодна паведамлення германска га інфармацыйнага бюро, у раёне Вены—Мейдлінг сёння ўрадавыя войскі пачалі атаку раду муніцыпальных дамоў, у якіх забарыкадваліся члены шуцбунда. Войскі дзве гадзіны абстрэльвалі будынкі з кулямётаў. У ход пушчан таксама бранявы аўтамабіль. Члены шуцбунда з усіх вакон будынка энергічна адказвалі на стрэльбу ўрадавых войск.

***

ПРАГА, 14 лютага. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення з Вены, віцэ-канцлер Фей, у руках якога ў якасці міністра безапаснасці скан цэнтравана камандванне ўсімі паліцэйскімі і жандармскімі, а таксама мабілізаванымі ў якасці дапаможнай паліцыі хеймвераўскімі сіламі, сказаў па радыё прамову.

У процілегласць учарашнім заявам урада, што ён «гаспадар становішча», Фей вымушан прызнаць, што баі прадаўжаюцца і сёння з заядласцю. Фей звярнуўся з заклікам да рабочых адмовіцца ад далейшай барацьбы, пагражаючы «знішчэннем, хто супраціўляецца».

Характарызуючы становішча ў асноўных цэнтрах супраціўлення рабочых мас, Фей пацвярджае, што ў Вене заводскія рабочыя і шуцбундаўцы заняілі рад комунальных жылых дамоў і ўстапоў, у тым ліку дом імя Карла Маркса ў раёне Гейлігенштадт, рабочы гарадок Зандлейтэн у раёне Герналь, рабочы дом у раёне Оттакрынг, вакзал Астанг, Усходні вакзал, гарадскія бойні, чыгуначныя майстэрні ў Зімерынг і цэлыя кварталы комунальных жылых дамоў. Паводле слоў Фея, толькі пасля доўгага артылерыйскага агня войскам удалося прымусіць рабочых з буйнымі стратамі адступіць.

З выключнай жорсткасцю вяліся баі на вуліцы Ківеленштраса ў раёне Флорыдсдорфа (буйнейшы заводскі раён Вены). У радзе комунальных дамоў, якія знаходзяцца на гэтай вуліцы, знаходзілася 400 рабочых членаў шуцбунда, якія атрымалі падмацаванне з боку раённай комунальнай пажарнай каманды. Пасля доўгіх баёў войскі заняілі ўчора ўвечары Шлінгельгоф і захапілі там два кулямёты і 300 ручных гранат.

Аб узрастаючым супраціўленні рабочых сведчыць таксама афіцыяльнае паведамленне начальніка ведамства па справах безапаснасці ў верхня-аўстрыйскіх раёнах, паводле слоў якога, рабочыя, адступаючы зноў, хаваюць зброю. Вось чаму афіцыяльнае паведамленне папярэджвае ўсіх домаўласнікаў, што ў выпадку выяўлення складаў зброі, яны будуць разам з хаваючымі зброю прыцягвацца да палявога суда.

КОНТРАТАКА ВЕНСКІХ ПРОЛЕТАРЫЯЎ

ЛОНДАН, 15 лютага. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Дэйлі тэлеграф», баі ў Аўстрыі прадаўжаюцца. Аўстрыйскія ўлады, не жадаючы, каб насельніцтва атрымала правільную інфармацыю аб падзеях, забаранілі ўчора ўвечары продажу ўсіх без выключэння чэхаславацкіх і германскіх газет.

Рабочыя, якія ўмацаваліся ў жыллёвым камбінаце імя Гетэ, трымаюцца стойка, не гледзячы на агонь гаўбічнай батарэі з процілегласці берага Дуная. Акружаючыя дамы былі ахоплены полымем, але рабочыя прадаўжалі адстрэльвацца пры кожнай новай атацы на іх пазіцыі. У прыгарадзе Фаварытэн самы буйны хлебны завод Вены ўсё яшчэ знаходзіцца ў руках рабочых шуцбундаўцаў, не гледзячы на тое, што з 12-га лютага ён знаходзіцца пад безупынным абстрэлам.

Рабочыя ўтрымліваюць за сабой у Фаварытэне таксама будынкі чатырох буйных жыллёвых камбінатаў, а ў прыгарадзе Зімерынг будынкі трох камбінатаў. У Гейлігенштадце на правым беразе Дуная прадаўжаецца стральба вакол жыллёвага камбіната імя Карла Маркса. Будынкі гэтыя былі некалькі раз заняты войскамі, але рабочыя кожны раз зноў выцясняілі іх.

У паўночна-ўсходнюю частку Вены сёння раніцою ўрад выклікаў з правінцыі ваенныя падмацаванні з мэтай напасці з фланга на рабочых, якія ўмацаваліся ў жыллёвых камбінатах. Аднак, гэтыя напады былі адбіты і рабочыя перайшлі ў магутную контратаку. Гэта контратака была спынена толькі моцным агнём цяжкай артылерыі, размешчанай на ўзгорках у тылу рабочых. У рэзультаце рабочыя вымушаны былі адступіць у паўднёвым напрамку да Каўрана, дзе яны зараз займаюць моцныя пазіцыі.

ВАРШАВА. 15 лютага (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Вены, там да раніцы прадаўжаліся крывавыя баі паміж рабочымі і войскамі. Найбольш заядлая барацьба адбываецца ў трох месцах, дзе забарыкаваліся рабочыя шуцбунда: у жыллёвым камбінаце, заселеным рабочымі, у Кайзермюлене каля Флорыдсдорфа, у жыллёвым камбінаце імя Гетэ ў Фаварытэне і ў раёне Лаерберг. Рабочым, якія ўмацаваліся ў жыллёвым камбінаце імя Гетэ, быў прадаўлен ультыматум здацца да 6 гадзін раніцы. Калі рабочыя адхілілі ультыматум, войскі пачалі бамбардыроўку бомбамётамі. З паліцэйскіх самалётаў былі скінуты самаўзгаральныя бомбы. Галоўны будынак камбіната імя Гетэ загарэўся, а хеймверы не дапускалі да будынка пажарную каманду, патрабуючы, каб рабочыя капітулявалі. Баі прадаўжаліся да раніцы. Рабочыя адбіваліся залпамі кулямётнага і аружэйнага агня. Войскі абстрэльвалі камбінат імя Гетэ з цяжкай артылерыі. Згодна афіцыяльных вестак, пасля поўначы войскі заняілі гэтыя дамы штурмам. Шалёную атаку войскі павялі таксама супроць венскага прадмесця Едлерзее, дзе рабочыя забарыкадаваліся ў будынках школы і ратушы. Рабочыя ўзялі ў якасці заложнікаў 10 паліцэйскіх.

Урад праводзіць вярбоўку новых добраахвотніцкіх часцей. 300 былых афіцэраў запаса, у тым ліку члены саюза франтавікоў, аб'явілі аб сваёй гатоўнасці змагацца супроць паўстаўшых рабочых.

З правінцыі паведамляюць, што ў Верхняй Аўстрыі і ў Верхняй Штырыі сутычкі прадаўжаюцца. Асабліва жорсткія баі адбываюцца ў ваколіцах Лінца, Штэйра і Брукка-на-Муры. Рабочыя—члены шуцбунда мясцамі скрыліся ў лясах, дзе арганізуюць партызанскія атрады. Барацьба адбываецца так сама на важным чыгуначным вузле ў Вэргле (Тыроль)

АБ ДРУГІМ ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР (1933-1937 г. г.)

Рэзалюцыя XVII з'езда ВКП(б) па дакладу т. т. МОЛАТАВА і В. КУЙБЫШЭВА

(ПРЫНЯТА АДНАГАЛОСНА)

Геройчнай барацьбой рабочага класа ўжо за гады першай пяцігодкі пабудован фундамент сацыялістычнай эканомікі, разгромлены апошні капіталістычны клас — кулацтва, а асноўныя масы сялянства — калгаснае сялянства — замацаны моцнай апорай совецкай улады ў вёсцы. СССР канчаткова ўмацаваўся на сацыялістычным шляху.

У гады першай пяцігодкі ў СССР пабудавана буйная тэхнічна-перадавая прамысловасць, пры чым асабліва значныя поспехі дасягнуты ў справе стварэння сучаснай цяжкай індустрыі — матэрыяльнай базы сацыялізма, асновы рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі і ўмовы для паскорана га развіцця лёгкай, харчовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Нанава арганізаваны дзесяткі новых галін вытворчасці: складанае варштатабудаўніцтва, аўтамабільная і трактарная прамысловасць, камбайнабудаўніцтва, самалёта- і аўтаматорабудаўніцтва, вытворчасць магутных турбін і генератараў, вытворчасць якасных сталей, ферасплываў, алюмінія, сучасная хімічная прамысловасць, прамысловасць сінтэтычнага каўчука, азота, штучнага валакна і інш. Рэканструяваны на аснове сучаснай тэхнікі прыкладная, шкляная, абутковая, мясная, кансервовая, папяровая прамысловасць і т. д. Пабудаваны тысячы перадавых трактарных станцый, якія пераводзяць усю нарэшце гаспадарку на высокую ступень новай тэхнічнай культуры і знаходзяцца на ўзроўні лепшых узораў капіталістычнай тэхнікі.

Карэнным чынам рэканструявана ў першай пяцігодцы сельская гаспадарка. Пролетарыят, кіруемы ленінскай партыяй, пераканаў мільёны сялянства ў перавазе калектыўнай вытворчасці і стварыў у вёсцы новы, калгасны лад. Перамогі ў развіцці прамысловасці абумовілі гігантскія поспехі па пераводу сельскай гаспадаркі на рэйкі машыннай тэхнікі. СССР стаў краінай самай буйнай у свеце сельскай гаспадаркі.

Буйныя поспехі ў стварэнні новай, сацыялістычнай прамысловасці, рост аграмадных мас працы, рост кваліфікацыі рабочых, значныя дасягненні ў арганізацыі вытворчасці дазволілі дабіцца ў хуткім тэхнічнай рэканструкцыі агромадных перамог у справе павышэння прадукцыйнасці працы. Па тэмпах росту прадукцыйнасці працы СССР аставіў позаду ўсе капіталістычныя краіны, нават параўнальна з гадамі вышэйшага падёму.

Пролетарыят, перамогшы агромадныя групасці, выпхаючы з ажыццяўлення пяцігадовага плана, дабіўся гістарычнага значэння перамог у справе паляпшэння становішча працоўных горада і вёскі. Перажыў совецкага ладу ўжо на пасягнутай ступені развіцця дазволілі поўнасцю ліквідаваць беспрацоўе, увесці семігадзінны рабочы дзень, зніччыць эксплёатацыю і пэўнерыям у вёсцы.

Рабочы і калгаснік атрымалі поўную ўпэўненасць у заўтрашнім дні, і толькі ад якасці і колькасці затрачваемай імі працы залежыць усё большае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню іх жыцця. Для працоўных у СССР знікла нарэшце беспрацоўе, галеча, голад. Упэўнена і радасна глядзіць кожны рабочы і калгаснік на сваю будучыню, прад'яўляючы ўсё больш павышаныя патрабаванні да ведаў і культуры.

За гады першай пяцігодкі СССР ператварыўся ў краіну перадавой культуры, ліквідавана непісьменнасць дзесяткаў мільёнаў рабочых і сялян і ажыццёлен пераход да ўсеагульнага абавязковага навучання. Шырока разгарнуцца газэтна-кніжная асвета, рэзка ўзрос тыраж газет, журналаў і другіх друкаваных выданняў. Значныя поспехі дасягнуты ў галіне развіцця навукова-тэхнічнай мыслі, самастойна вырашыўшай рад буйнейшых тэхнічных праблем.

Асабліва значны гаспадарчы і культурны рост меў месца ў нацыянальных раёнах Саюза, быстра ідучых па шляху канчатковай ліквідацыі сваёй адсталасці.

У выніку пяцігодкі перад тварам сацыя мільёнаў працоўных усяго свету ўпершыню ў гісторыі чалавецтва на справе даказана магчымасць пабудовы сацыялізма ў адной краіне.

Усе гэтыя поспехі першай пяцігодкі падрыхтавалі прадпасылкі і магутную базу для пабудовы і ажыццяўлення другой пяцігодкі.

«Асноўнай галоўнай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца канчаткова ліквідацыя капіталістычных элементаў і класаў наогул, поўнае знішчэнне прычын, парджаючых класавую роспасць і эксплоатацыю, і перамаганне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, ператварэнне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў свядомых і актыўных будаўнікоў бескласавага сацыялістычнага грамадства» (XVII партканферэнцыя).

Канчатковая ліквідацыя астаткаў паразітычных класаў і агульны рост народнага даходу, цалкам ідучага ў распараджэнне працоўных, павінны забяспечыць у другім пяцігодзьдзі яшчэ больш высокі падём добрабыту рабочых і калгасных мас, спатны рост рэальнай заработнай платы, павышэнне ўзроўню спажывання працоўных у 2-3 разы.

Ажыццяўленне гэтых задач магчыма толькі на базе разгорнутай тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі. Таму асноўнай і рашаючай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца завяршэнне рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Рашаючай-жа ўмовай завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы паслужыць з'яўляецца асваенне новай тэхнікі і новых вытворчасцей. **«Пафас новага будаўніцтва...»** павінен быць дапоўнены ў другім пяцігодзьдзі «тафасам асваення новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным узмацненнем працуцыйнасці працы, сур'ёзным скарачэннем сабекошту» **(СТАЛІН).**

I. ЗАВЯРШЭННЕ ТЭХНІЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ І ПРАГРАМА РОСТУ ПРАДУКЦЫІ Ў ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

XVII з'езд ВКП(б) запвятужае праграму завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі і росту прадукцыі ў другім пяцігодзьдзі, прадстаўленую дзяржаўнай плановай камісіяй Саюза і прынятую ЦК ВКП(б) і СНК СССР.

З'езд ВКП(б) пастанаўляе:

1. Устанавіць аб'ём прадукцыі па ўсёй прамысловасці ў 1937 г., г. зн. у канцы другой пяцігодкі, у 92,7 млрд. руб. (у цэнах 1926-27 г.) супроць 43 млрд. руб. у канцы першай пяцігодкі — у 1932 г., г. зн. сярэднягадавы прырост у 16,5 проц. і павялічэнне размераў прамысловай прадукцыі ў 2,1 раза, а параўнальна з даваенным узроўнем, прыкладна ў 8 раз. Па выпуску прадметаў шырокага спажывання намецілі больш быстрыя тэмпы развіцця не толькі параўнальна з першай пяцігодкай (сярэдні гадавы тэмп росту 18,5 проц. супроць 17 проц. у першай пяцігодцы), але і параўнальна з тэмпамі развіцця выпуску сродкаў вытворчасці ў другой пяцігодцы (сярэднегадавы тэмп росту 18,5 проц. супроць сярэднегадавога тэмпа росту сродкаў вытворчасці ў 14,5 проц.).

2. Вызначыць наступны размер прадукцыі па важнейшых галінах прамысловасці.

Заданне на 1937 г.

	Абсал.	У проц. да 1932 г.		Абсал.	У проц. да 1932 г.
Уся прамысловасць у цэнах 1926-27 г. у млрд. р.	92,7	214,1	Аўтамабілі (у тыс. шт.)	200	837,0
У тым ліку:			Электраэнергія, млрд. квт. гадз.	38	283,0
Выраб сродкаў вытворчасці	45,5	197,2	У тым ліку:		
Выраб прадметаў спажывання	47,2	233,6	Раённыя станцыі Галоўэнерга	24,5	296
Наркамцяжпром (млрд. р.)	33,5	234,6	Каменны вугаль (млн. тон)	152,5	237
Наркамлес (млрд. р.)	3,6	200,0	Нафта сырая з газам (млн. тон)	46,8	210
Наркамлегпром (млрд. р.)	19,5	248,8	Чыгун (млн. тон)	16	260
Наркамснаб (млрд. р.)	11,9	256,1	Сталь (млн. тон)	17	289
Машынабудаўніцтва і металаапрацоўка (у цэнах 1926-7 г., у млрд. р.)	19,5	207,0	Пракат (млн. тон)	13	303
У тым ліку:			Хімічная прамысловасць (у цэнах 1926-27 г., у млрд. р.)	5,5	280
Варштаты металарэжучыя (у тыс. шт.)	40	267,0	Піламатэрыялы (у млн. кбм.)	43	176
Трактары ва ўмоўн. 15-сільных (тыс. шт.)	167	323,0	Баваўняныя тканіны (у млн. метр.)	5.100	188
Камбайны (у тыс. шт.)	20	200	Льняныя тканіны (у млн. кв. метр.)	600,0	461
Паравозы магістральныя (у пераліку на ўмоўн. „Э" і „СУ" у штуках)	2.800	337	Абутак (у млн. пар.)	180	220
Вагоны таварныя ў двухвосным вылічэнні, (у тыс. шт.)	118,4	531	Цукар-пясок (у тыс. тон)	2.500	302
			Рыба—улоў (у тыс. т.)	1.800	139
			Мяса (НКСнаб, млн. тон)	1.200	276
			Кансервы (млн. банак)	2.000	335

Выходзячы з таго, што мясцовая прамысловасць можа з'явіцца сур'ёзным дадатковым фактарам у справе ўсебаковага задавалення быстра ўзрастаючых патрэбнасцяй рабочых і калгаснікаў, з'езд вызначае рост вытворчасці прадметаў шырокага спажывання мясцовай прамысловасці ў другой пяцігодцы ў тры разы і абавязвае мясцовыя органы да праяўлення максімальнай ініцыятывы ў справе развіцця мясцовай прамысловасці і адшукання новых відаў сырцу.

Адначасова з'езд абавязвае ЦК і СНК узмацніць мясцовую прамысловасць шляхам перадачы ў ведан не мясцовых органаў раду прадпрыемстваў саюзнай і рэспубліканскай прамысловасці, а таксама правесці перадачу значнай часткі прыбыткаў мясцовай прамысловасці ў распараджэнне мясцовых выканкомаў.

3. З'езд указвае, што для выканання ўстаноўленай праграмы развіцця прамысловасці і ажыццяўлення тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі неабходна:

а) правесці тэхнічнае **пераўзбраенне** ўсіх галін народнай гаспадаркі СССР, якое-б забяспечыла ўкараненне ў найкарацейшы тэрмін навейшых тэхнічных дасягнеў навукі і атрыманне ў 1937 г. каля 80 проц. усёй прадукцыі прамысловасці з новых прадпрыемстваў, пабудаваных або цалкам рэканструяваных за першую і другую пяцігодкі. Прылады вытворчасці, накіроўваемыя ў народную гаспадарку, толькі за гады другога пяцігоддзя павінны скласці ў канцы другога пяцігоддзя 50-60 проц. дзействуючых прылад вытворчасці ва ўсёй народнай гаспадарцы;

б) ажыццявіць такую рэканструкцыю машынабудаўніцтва — гэтай галіны народнай гаспадаркі — якая забяспечыла-б задаваленне ўласнымі сілакі ўсіх патрэбнасцяй народнай гаспадаркі ў сучасным, тэхнічна-перадавым абсталяванні, пры шырокім развіцці новых відаў вытворчасці. У другім пяцігоддзі павінна быць асвоена вытворчасць да 200 тыпаразмераў навейшых варштатаў. Металургічнае машынабудаўніцтва павінна асвоіць поўны камплект абсталявання для ўсіх металургічных пэхаў, машынабудаўніцтва для лёгкай і харчовай прамысловасці, дзесяткі новых тыпаў машын. Сельскагаспадарчае машынабудаўніцтва павінна асвоіць усе віды машын і прычэпнага трактарнага інвентара, неабходных для ажыццяўлення далейшай механізацыі сельскай гаспадаркі і ў асаблівасці механізацыі працаёмкіх працэсаў тэхнічных і прамышленных культур. Павінна быць расшырана вытворчасць абсталявання для дарожных работ, для комунальнай гаспадаркі і жыллёва-бытавога будаўніцтва;

в) завяршыць у асноўным механізацыю ўсіх працаёмкіх і цяжкіх працэсаў у прамысловасці. Па каменнаму вугалю павысіць механізацыю заруб к канцу пяцігодкі да 93 проц. пры адпаведным падцягванні ўзроўню механізацыі астатніх працэсаў; па чорнай металургіі павысіць механізацыю да ўзроўню, які-б забяспечваў атрыманне 80 проц. чыгуну з поўнасцю механізаваных домен; па торфяной прамысловасці вызначыць здабычу торфу механізаванымі спосабамі звыш 70 проц. агульнай здабычы; у галіне будаўніцтва механізацыю асноўных працэсаў павысіць да 80 проц. і ажыццявіць механізацыю здабычы мясцовых будаўнічых матэрыялаў: механізацыю асноўных лесазагатоўчых працэсаў—вывазкі павялічыць у 6 раз, раздзелкі — у тры разы; ажыццявіць механізацыю выпальвання дрэўнага вугалю;

г) стварыць новую энергетычную базу для завяршэння рэканструкцыі ўсіх галін народнай гаспадаркі і стварыць ва ўсіх энергетычных вузлах рэзервы магутнасцяй, якія-б забяспечвалі бесперабойнае электраспажыванне народнай гаспадаркі. Завяршыць у асноўным электрыфікацыю прамысловасці найшырэйшым скарыстаннем навейшых электраёмкіх метадаў вытворчасці ва ўсіх галінах прамысловасці, асабліва ў металургіі і хіміі (рост спажывання энергіі электраёмкімі вытворчасцямі больш чым у 9 раз), шырокім развіццём электрыфікацыі транспарта і паступовым укараненнем электраэнергіі ў вытворчыя працэсы сельскай гаспадаркі. Шырэй разгарнуць цепла фікацыю прамысловасці і буйных гарадоў. Прадаўжаць лінію на больш шырокае скарыстанне для электраспажывання мясцовых відаў апалу—вугалю Падмаскоўнага басейна, Урала, Усходняй Сібіры, Сярэдняй Азіі, торфу і сланцаў і асабліва гідраэнергетычных рэсурсаў.

Завяршыць у другой пяцігодцы кальцаванне раённых станцый у межах раёнаў і пачаць міжраённае кальцаванне станцый са стварэннем ужо ў другім пяцігоддзі буйнейшай у свеце сістэмы электраспажывання (Данбас—Прыднепроўе з выпрацоўкай 9 млрд. квт. гадзін у год); разгарнуць газіфікацыю торфу і сланцаў;

д) поўнасцю ліквідаваць адставанне чорнай металургіі ад агульных тэмпаў развіцця народнай гаспадаркі. Падвоіць за гады пяцігодкі магутнасць металургіі і дабіцца хутчэйшага перамагання разрыву паміж магутнасцю доменных і адстаючых ад іх сталеплавільных і асабліва пракатных цэхаў; разгарнуць вытворчасць розных відаў метала — якасны метал, электрасталь, ферасплавы, складаныя профілі праката і т. д., у размерах, поўнасцю задавальняючых патрэбнасці народнай гаспадаркі; правесці шырокую рэканструкцыю жалезарудной прамысловасці, шырока ўкараняючы метады ўзбагачэння і агламерацыі руд.

Дабіцца асабліва быстрых тэмпаў развіцця і тэхнічнага пераўзбраення ў каляровай металургіі, ажыццявіць канчатковы пераход да сучаснага спосабу атрымання медзі (флатацыя, атражальныя печы) і шырока ўкараніць у вытворчасць цынка перадавы электралітычны метад, з атрыманнем пры дапамозе яго ў 1937 г. 70 проц. усяго цынка, арганізаваць вытворчасць волава, нікеля, магнія і шырока разгарнуць вытворчасць алюмінія; поўнасцю задаволіць патрэбнасці ўсёй народнай гаспадаркі, і ў асаблівасці электрыфікацыю ў прадукцыі каляровай металургіі,

е) дабіцца рашаючых зрухаў у развіцці хімічнай прамысловасці, якія-б забяспечвалі шырокую хімізацыю ўсіх галін народнай гаспадаркі і ўмацаванне абароназдольнасці краіны. Вытворчасць усіх відаў угнаенняў за гады другой пяцігодкі павысіць у 10 раз; шырока разгарнуць працэс стварэння раду новых вытворчасцяй хіміі (хімічная пераапрацоўка цвёрдага апалу — вугалю, торфу, сланцаў, новыя віды фарбавальнікаў, пласт масы, сінтэтычны каўчук і т. д.); укараніць навейшыя тэхналагічныя працэсы ў хімічную прамысловасць (шырокае развіццё электратэрмічных і электралітычных метадаў, правядзенне рэакцый у газавых фазах і т. д.); узмацніць камбінаванне хімічнай прамысловасці з іншымі галінамі прамысловасці (коксавай прамысловасцю, каляровай металургіяй, чорнай металургіяй і інш.) і ўцягненне раду новых відаў сырцу;

ж) ўсямерна разгарнуць вытворчасць важнейшых галін лёгкай і харчовай прамысловасці на аснове стварэння буйнай машынай індустрыі—павышэнне ўдзельнай вагі аўтаматычных ткацкіх варштатаў у баваўнянай прамысловасці да 40 проц. к канцу пяцігодкі, і замена адсталых прадзільных машын сучаснымі машынамі; ліквідаваць тэхнічную адсталасць льняной прамысловасці шляхам укаранення быстраходных машын і карэннай рэканструкцыі першапачатковай апрацоўкі ільну; ажыццявіць усебаковую механізацыю трыкатажнай, швейнай і абутковай вытворчасцяй; стварыць буйную машынную мясную індустрыю на аснове развіцця камбінавання, павысіць удзельную вагу механізаванага лову рыбы да 70 проц. здабычы дзяржаўнай рыбнай прамысловасці шляхам значнай рэканструкцыі тэхнічнага флота; шырока рэканструяваць маслабойную прамысловасць на аснове ўкаранення найбольш эфектыўнага экстракцыйнага спосабу вытворчасці.

4. Ажыццяўленне задач тэхнічнай рэканструкцыі прамысловасці патрабуе паспяховага асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцяй, што павінна знайсці сваё выражэнне ў значным росце **прадукцыйнасці працы** і сур'ёзным **зніжэнні сабекошту.** У адпаведнасці з гэтым з'езд устанаўляе:

а) рост прадукцыйнасці працы за другое пяцігоддзе па прамысловасці на 63 проц. супроць 41 проц. у першай пяцігодцы, г. зн. у такіх размерах, пры якіх прадукцыйнасць працы становіцца рашаючым фактарам выканання намечанай праграмы павялічэння прадукцыі ў другім пяцігоддзі;

б) зніжэнне сабекошту па ўсёй прамысловасці на 26 проц., якое-б забяспечыла накапленне ў 1937 г. за кошт зніжэння сабекошту ў на мячаемых размерах параўнальна з узроўнем сабекошту ў 1932 г. — не менш 13 млрд. руб.;

в) адначасова са зніжэннем сабекошту дабіцца рэзкага паляпшэння **якасці і асартымента** прадукцыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Дабіцца значнага змяншэння зместу попелу і серкі ў вугалі, павысіць гатунковасць у металургіі, палепшыць якасць і каефіцыент карыснага дзеяння машын, павысіць нумарнасць пражы, рэзка палепшыць якасць баваўняных і льняных тканін, павялічыць удзельную вагу топкасукопных і камвольных груп шарсцяной прамысловасці, павысіць удзельную вагу тонкай шэрсці ў тканінах, рэзка палепшыць якасць мыла за кошт пераходу на большую тлушчавую аснову, палепшыць якасць абутку як за кошт спосабаў пашыўкі, так і за кошт ужываемага сырцу, палепшыць якасць прадукцыі мясной прамысловасці за кошт павышэння ўдзельнай вагі свініны, каўбасных вырабаў, харчовага сала, палепшыць якасць прадукцыі рыбнай прамысловасці шляхам павялічэння ўдзельнай вагі лепшых гатункаў рыбы, значна палепшыць асартымент і прадукцыю мукамольнай прамысловасці за кошт павялічэння ўдзельнай вагі высокіх гатункаў памолу.

5. XVII з'езд вызначае рост прадукцыі па ўсёй **сельскай гаспадарцы** за гады пяцігодкі з 13,1 млрд. руб. (у цэнах 1926-27 г.) да 26,2 млрд. руб., г. зн. у два разы.

Па важнейшых галінах сельскай гаспадаркі з'езд абавязвае дасягнуць наступнага размеру прадукцыі: зернавых культур—1.048 млн. цэнтн. пры ўраджайнасці 10 цэнтн. з гектара, цукровых буракоў — 276 млн. цэнтн. пры ўраджайнасці да 200 цэнтн. з гектара, бавоўны-валакна — 7 млн. цэнтн. пры ўраджайнасці абвадняемай бавоўны 12 цэнтн. з гектара, ільнавалакна—8 млн. цэнтн., пры ўраджайнасці да 3,7 цэнтн., а прадукцыю жывёлагадоўлі павысіць у два з чвэрцю разы.

6. З'езд падкрэслівае, што намечаны прырост прадукцыі сельскай гаспадаркі можа быць дасягнут толькі на аснове поўнага завяршэння калектывізацыі і ажыццяўлення тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй сельскай гаспадаркі, для чаго неабходна:

а) ператварыць зернавыя, жывёлагадоўчыя, бурачныя, баваўняныя і іншыя совгасы ва ўзорныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы на аснове ўпартай работы па асваенню тэхнікі буйнай машынай гаспадаркі, поўнага ўвядзення правільных севазваротаў і арганізацыі насеннай справы, паляпшэння пародзістасці жывёлы, павышэння якасці прадукцыі і павялічэння здачы дзяржаве хлеба, буракоў, бавоўны, мяса, малака, масла, скуры і шэрсці і рашучага паляпшэння ўсёй арганізацыі вытворчасці з разузбуйненнем гаспадарак совгасаў, ліквідацыяй праз мернай спецыялізаванасці і т. д.;

б) павялічыць колькасць МТС з 2.446 у 1932 г. да 6 тыс. у 1937 годзе, ахапіўшы машынатрактарнымі станцыямі ўсе калгасы;

в) павялічыць трактарны парк з 2.225 тыс. конскіх сіл у 1932 годзе да 8.200 тыс. конскіх сіл у 1937 г., г. зн. у 3,7 разы, парк камбайнаў—да 100 тыс. шт. і аўтамабільны парк у сельскай гаспадарцы да 170 тыс. машын, г. зн. больш чым у 12 раз.;

г) завяршыць у асноўным механізацыю сельскай гаспадаркі: трактарнае ворыва і падём зябі ў 1937 г. павінны скласці 80 проц., культывацыя—70 проц. уборка зернавых трактарнымі ўборачнымі машынамі—60 проц. і механізацыя малацьбы—85 проц.;

д) шырока ўкараніць сістэму агратэхнічных мерапрыемстваў: усюды ўвесці правільныя севазвароты, правесці пасеў чыстасортным насеннем 75 проц. пасеўнай плошчы зернавых культур, 50 проц. пасеўнай плошчы ахапіць зяблевым ворывам;

е) павысіць забяспечанасць пасеву бавоўны азоцістымі ўгнаеннямі за другую пяцігодку з 6 проц. плошчы пасеву да 80 проц.; па бураку—азоцістымі ўгнаеннямі з 6 проц. да 40 проц. і фосфарам замест 9 проц. — усю плошчу і шырока разгарнуць ірыгацыйныя работы, расшырыўшы абвадняемыя плошчы на 1 млн. га.

7. З'езд устанаўляе наступны рост грузааабароту асноўных відаў транспарта: чыгуначнага — з 169 млрд. тона-кілометраў у 1932 г. да 300 млрд. тона-кілометраў у 1937 г.; рэчнага транспарта—з 26 млрд. тона-кілометраў да 63 млрд. тона-кілометраў; марскога—з 18 млрд. тона-кілометраў да 51 млрд. тона-кілометраў і аўтатранспарта—з 1 млрд. тона-кілометраў да 16 млрд. тона-кілометраў.

У мэтах больш рацыянальнага размеркавання грузавой работы па між паасобнымі відамі транспарта, з'езд указвае на неабходнасць павышэння ў грузавой рабоце краіны ўдзельнай вагі новых відаў транспарта — аўта- і авіятранспарта, а таксама воднага транспарта, пры астаўленні асноўнай ролі за чыгуначным транспартам.

8. З'езд падкрэслівае неабходнасць **тэхнічнай рэканструкцыі транспарта і сувязі,** якая павінна быць праведзена па наступных асноўных напрамках:

а) ажыццяўленне рэканструкцыі важнейшых **чыгуначных** ліній—электрыфікацыя пяці тыс. клм. чыгуначных ліній, укладка на найбольш затруднёных асноўных магістралях каля 9.500 клм. другіх пуцей (чыгункі Урала-Кузбаса, Забайкальская і Усурыйская чыгункі, чыгунка Данбаса і т. д.); павялічэнне даўжыні станцыйных шляхоў на чыгуначных вузлах і станцыях на 8.500 клм.; замена лёгкага тыпу рэек цяжкімі на працягу да 20 тыс. клм.; шырокае будаўніцтва мастоў; абсталяванне 8.500 клм. сеткі аўтаблакіроўкай; узмацненне дзействуючых шляхоў (пераход на шчэбёначны баласт, павялічэнне колькасці шпал на 1 клм. шляху і т. д.).

б) павялічэнне парку лакаматываў з 19,5 тыс. шт. у 1932 г. да 24,6 тыс. шт. у 1937 г. пры адна часовым ажыццяўленні пераходу да больш магутных і пасканалых тыпаў лакаматываў: магутны паравоз «ФД» павінен стаць у другім пяцігоддзі асноўнай адзінкай таварнага паравознага парка, а магутны паравоз «Ю» асноўнай адзінкай пасажырскага паравознага парка; больш шырокае прымяненне павінны знайсці цеплавозы і электравозы;

в) рост вагоннага парка з 552 тыс. шт. у 1932 г. да 800 тыс. шт. у 1937 г. (у двухвосным вылічэнні) пры значным павялічэнні ўдзельнай вагі вялікагрузных вагонаў і абсталяванні поўнасцю ўсяго вагоннага парка аўтатармазамі і не менш паловы вагоннага парка аўтасцэпкай;

г) ажыццяўленне будаўніцтва буйнейшых новых чыгуначных ліній: Байкала-Амурская магістраль, Акмалінск—Карталы, Масква—Донбас, Караганда—Балхаш, Уфа—Магнітная і другіх, павялічваючых агульную працаёмкасць сеткі чыгунак з 83 тыс. клм. на 1 студзеня 1933 г. да 94 тыс. клм. на 1 студзеня 1938 г.;

д) **па воднаму транспарту** павінна быць праведзена гігантская будаўніцтва штучных водных шляхоў — каналаў: Беламорска-Балтыцкі канал даўжынёй у 227 клм. (скончана першая чарга ў першы год другой пяцігодкі), Масква-Волга канал даўжынёй у 127 клм., Волга-Дон канал даўжынёй у 100 клм., рэканструкцыя Марыінскай і Масквавэцкай водных сістэм, што разам з вялікім падёмам гідратэхнічных работ на дзействуючых водных шляхах (сказны шлях па Дняпру, шлюзаванне ракі Сож, рэканструкцыя Сярэдняй Волгі) у асноўным забяспечыць рэканструкцыю водных шляхоў і стварэнне адзінай воднай сістэмы еўрапейскай часткі СССР, звязваючай Белае, Балтыцкае, Чорнае і Каспійскае моры. Даўжыня суднаходных шляхоў за другое пяцігоддзе павінна ўзрасці з 84 тыс. да 101 тыс. клм. са значным паляпшэннем суднаходных умоў на іх. Карэнным чынам павінен быць абноўлен і рэканструяван морскі і рачны флот, а таксама развіта будаўніцтва мелкасядзячых суднаў для выкарыстання мелкіх рэк;

е) **па аўтадарожнаму транспарту** парк аўтамабіляў павінен узрасці з 75 тыс. машын на 1 студзеня 1933 г. да 580 тыс. машын на 1 студзеня 1938 г., або амаль у 8 раз; шырока павінна быць разгорнута будаўніцтва сеткі грунтовых і шасейных дарог з ліквідацыяй у асноўным бездарожжа і павялічэннем агульнай дарожнай сеткі краіны на 210 тыс. клм., не лічачы значнага будаўніцтва, праводзімага за кошт мясцовых рэсурсаў;

ж) **па грамадзянскаму паветранаму флоту** сетка паветраных ліній саюзнага значэння ў другім пяцігоддзі павінна ўзрасці з 32 тыс. клм. да 85 тыс. клм., г. зн. амаль у тры разы. Побач з гэтым павінна быць разгорнута шырокае будаўніцтва мясцовых паветраных ліній з давядзеннем іх эксплоатацыйнай даўжыні ў 1937 г. да 35 тыс. клм;

з) рашаючыя зрухі павінны быць дасягнуты ў механізацыі **пагрузачна-разгрузачных работ** на транспарце, з ростам механізацыі на чыгуначным транспарце ў 3 разы (з 18 да 57 проц.), на марскім — з 14 проц. і на рэчным транспарце — з 12 да 56 проц., г. зн. прыкладна ў 5 раз;

і) з'езд падкрэслівае неабходнасць вялікага развіцця сувязі ўсіх відаў, у асаблівасці радыё і карэннага паляпшэння якасці работы сувязі.

9. У адпаведнасці са значным павышэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы транспарта і стварэннем аграмадных магчымасцяй росту прадукцыйнасці працы, з'езд устанаўляе рост прадукцыйнасці працы па чыгуначнаму транспарту за другое пяцігоддзе — на 43 проц., па воднаму — на 86 проц. пры зніжэнні сабекошту ў цэлым па транспарту на 40 проц., у тым ліку па чыгуначнаму — на 10,5 проц., воднаму — на 36 проц. аўтатранспарту — на 54 проц.

10. Рашаючай умовай ажыццяўлення тэхнічнай рэканструкцыі, асваення тэхнікі і выканання заданняў па прадукцыйнасці працы з'яўляецца **падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых, тэхнікаў і інжынераў,** вырашэнне праблемы стварэння ўласнай пролетарскай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі. У адпаведнасці з гэтым з'езд устанаўляе наступную праграму падрыхтоўкі кадраў на другое пяцігоддзе:

а) падрыхтоўка 5 млн. работнікаў масавых кваліфікацый, у тым ліку 2,5 млн. чалавек у школах ФЗВ, звыш 1,5 млн. чалавек у стацыянарных школах і курсах сельскай гаспадаркі (трактарысты, брыгадзіры і т. п.) і 700 тыс. чалавек у школах і на курсах шоферaў;

б) выпуск на другое пяцігоддзе 340 тыс. спецыялістаў, скончыўшых ВНУ супроць 170,7 тыс. у першай пяцігодцы, або рост у два разы і 850 тыс. спецыялістаў, скончыўшых тэхнікумы, супроць

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.).

АБ ДРУГІМ ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР (1933-1937 г. г.)

Рэзалюцыя XVII з'езда ВКП(б) па дакладу т. т. МОЛАТАВА і В. КУЙБЫШЭВА

(ПРЫНЯТА АДНАГАЛОСНА).

308 тыс. у першай пяцігодцы, або рост у тры разы;

в) рост ліку кваліфікаваных спецыялістаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі з 2,7 млн. чалавек да 4 млн. чалавек, або на 46,5 проц., у тым ліку павялічэнне колькасці спецыялістаў у прамысловасці на 57 проц., на транспарце і у сувязі — на 60 проц. і падвоенне ў сельскай гаспадарцы.

11. З'езд указвае на неабходнасць найшырэйшага разгортвання работы навукова-тэхнічных інстытутаў і ў асаблівасці заводскіх лабараторый. Навукова-тэхнічная і вынаходніцкая думка павінна стаць магутнай зброяй у справе ўкаранення новай тэхнікі, арганізацыі новых відаў вытворчасці, новых метадаў скарыстання сырцу і энергіі.

II. ПРАГРАМА НОВАГА БУДАЎНІЦТВА Ў ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

12. Завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і запраектаваны размер вытворчых зладжанасцей па прамысловасці, сельскай гаспадарцы і транспарту патрабуюць ажыццяўлення ў другім пяцігодзьдзі агромадзнай будаўнічай праграмы.

XVII з'езд ВКП(б) ухваляе праграму будаўніцтва ў другім пяцігодзьдзі, распрацаваную дзяржаўнай планавай камісіяй і зацвярджае агульны аб'ём капітальных работ па народнай гаспадарцы на другое пяцігодзьдзе ў размеры 133,4 млрд. руб. (у цэнах 1933 г.) супроць 50,5 млрд. руб. за першую пяцігодку, з іх:

а) у прамысловасць 69,5 млрд. руб. супроць 25 млрд. руб. за першую пяцігодку, у тым ліку па прамысловасці, выробляючай сродкі вытворчасці, —53,4 млрд. руб. супроць 21,3 млрд. руб. або рост у 2,5 раза; па прамысловасці, выробляючай сродкі спажывання,— 16,1 млрд. руб., супроць 3,5 млрд. руб., або рост у 4,6 раза;

б) у сельскую гаспадарку — 15,2 млрд. руб., супроць 9,7 млрд. руб. за першую пяцігодку, або рост больш чым у паўтара разы;

в) у транспарт — 26,3 млрд. руб. супроць 8,9 млрд. руб., або рост у тры разы;

З'езд адзначае, што намечанае вялікае павялічэнне капітальнага будаўніцтва ў лёгкай, харчовай прамысловасці і транспарце паратуе галіны народнай гаспадаркі забяспечвае больш быстрыя тэмпы іх развіцця.

13. З'езд запатрабоўвае ўвод у эксплаатацыю новых і рэканструяваных прадпрыемстваў за другое пяцігодзьдзе агульным коштам у 132 млрд. руб. супроць 38,6 млрд. руб. у першай пяцігодцы, у тым ліку ў прамысловасці — 69,1 млрд. руб. супроць 15,7 млрд. руб., у сельскай гаспадарцы — 15,4 млрд. руб. супроць 9,2 млрд. руб. і ў транспарце 25,6 млрд. руб. супроць 7,7 млрд. руб.

14. Устаноўлены аб'ём капітальных работ і праграма ўводу ў эксплаатацыю новых і рэканструяваных прадпрыемстваў забяспечвае гігантскі рост вытворчай магутнасці Савецкага Саюза і стварэнне неабходных разоў магутнасці ў важнейшых галінах народнай гаспадаркі, а менна:

а) агульная сума асноўных фондаў узрастае за пяцігодзьдзе з 85 млрд. руб. да 195 млрд. руб. (у цэнах 1933 г.) што азначае павялічэнне асноўных фондаў у 2,3 разы, у тым ліку па прамысловасці — з 25,5 млрд. руб. да 77,0 млрд. руб., па сельскай гаспадарцы — з 11,4 млрд. руб. да 22,6 млрд. руб. і па транспарту — з 19,8 млрд. руб. да 38,5 млрд. руб.;

б) па важнейшых галінах прамысловасці вытворчыя магутнасці павялічваюцца: па чорнай металургіі (чыгуну) у 2,3 раза па каменнавугольнай прамысловасці —больш чым у 2 разы, па вытворчасці генератараў — 2,4 разы, па аўтамабільнай прамысловасці — амаль у 4 разы, па паравозабудаўнічых заводах — у 3,2 раза, па вагонабудаўнічых заводах — у 3,9 раза, па рабочых электрастанцыях — у 2,5 раза, па абутковай прамысловасці — у 2 разы, па бавоўняна-папяровай прамысловасці — у 1½ разы, па льняной прамысловасці — больш чым у два разы, па цукровай прамысловасці — у 1,5 раза, па буйных мясакамбінатах —у 2,5 раза.

15. З'езд лічыць неабходным асаблівую ўвагу сканцэнтраваць на наступных важнейшых будоўлях:

У машынабудаўніцтве — скончэнне пачатых будаўніцтвам у першай пяцігодцы Уральскага завода цяжкага машынабудаўніцтва, магутнасцю ў 100 тыс. тон. і Краматорскага ў 150 тыс. тон прадукцыі, завода хімічнай апаратуры на Урале, Луганскага паравозабудаўнічага завода магутнасцю ў 1.080 паравозаў «ФД» у год. Орскага паравоза і цеплапаравозабудаўнічага завода на 500 паравозаў і 500 цеплавозаў у год, Кашырскага электравознага завода на 300 магістральных электравозаў, Уральскага вагонабудаўнічага завода на 54 тыс. чатырохвосьных вагонаў, Кузнецкага і Іркуцкага вагонабудаўнічых заводаў магутнасцю па 10 тыс. чатырохвосьных вагонаў кожны, маторнага завода ў Уфе на 50 тыс. маторaў, Харкаўскага турбагенератарнага завода на 1,5 млн. квт., пашырэнне Горкаўскага аўтазавода да 300 тыс. машын, Маскоўскага аўтазавода імя Сталіна — да 80 тыс. машын, Яраслаўскага — да 25 тыс. пяцітонных грузавікоў і інш., будаўніцтва ў другім пяцігоддзі Уфімскага і Сталінградскага аўтазаводаў магутнасцю па 100 тыс. трохтонных грузавікоў кожны, Самарскага — на 25 тысяч пяцітонных грузавікоў, заводаў шліфавальных, радыяльна-свідравальных, зубарэзных, аўтаматычных і цяжкіх варштатаў, новага магутнага завода шарыкападшыпнікаў на 24 млн. шт., Уральскага электраапаратнага і трансфарматарнага завода, будаўніцтва групы заводаў тэкстыльнага машынабудаўніцтва і абсталявання для харчовай прамысловасці і т. д.

У галіне электрыфікацыі — будаўніцтва 79 раённых станцый, у ліку якіх завяршэнне будаўніцтва Зуеўскай станцыі ў 250 тыс. квт., Горкаўскай у 204 тыс. квт., Шатуры у 180 тыс. квт., Дуброўкі ў 100 тыс. квт, гідрастанцыі Свіры № 3 у 96 тыс. квт., скончэнне ДнепраДЭС магутнасцю ў 558 тыс. квт.; пабудаванне раду новых буйных цэнтраляй — Сталінагорскай у 400 тыс. квт., Кемераўскай у 148 тыс. квт., новых магутных станцый у Данбасе, гідрастанцый — Чырчыкскай № 1 у 170 тыс. квт., Канакірскай у 88 тыс. квт., на р. Храмі ў 60 тыс. квт., Свіры № 2 у 144 тыс. квт., Туломы і інш.; разгортванне будаўніцтва станцый Сярэдняволгабуду — Яраслаўскай у 100 тыс. квт., Пермскай у 310 тыс. квт., і Горкаўскай у 200 тыс. квт.; пабудаванне раду буйных цеплацэнтраляй для цеплафікацыі гарадоў — Маскоўска-Нараўскай і Охценскай у Ленінградзе, Сталінскай і Фрунзенскай у Маскве, Сормава-Канавінскай, Красназаводскай у Харкаве і інш., раду буйнейшых фабрычна-заводскіх станцый раённага значэння — Магнітагорская — 198 тыс. квт., Кузнецкая — 108 тыс. квт. і інш.

У каменнавугальнай прамысловасці — разгортванне буйнага шахтнага будаўніцтва і ўвод у эксплаатацыю 178 шахт магутнасцю ў 143 млн. тон. вугледабычы.

У нафтавай прамысловасці — будаўніцтва новай групы нафтаперапрацоўваючых заводаў (46 трубчатак першапачатковай перагонкі, 93 крэкінгі), будаўніцтва нафта і прадуктаправодаў агульнай даўжынёй звыш чатырох тыс. клм.

Разгортванне будаўніцтва торфяной і сланцавай прамысловасці.

У чорнай металургіі — завяршэнне будаўніцтва Магнітагорскага завода на 2,7 тон чыгуна, Кузнецкага, Запарожскага, Ніжнетагільскага, Азоўсталі, Крыварожскага, Ліпецкага, Тульскага і інш., разгортванне будаўніцтва і пуск першых агрэгатаў Бакальскага, Халілоўскага, другога Кузнецкага, далёкаўсходняга заводаў, трубаліцейных заводаў і інш.

У каляровай металургіі — Прыбалхашскага меднага камбіната на 100 тыс. тон, Сярэдне-Уральскага на 50 тыс. тон, завяршыць будаўніцтва Казполіметала на 60 тыс. тон свінца, цынкавых заводаў у гг. Чалябінску і Орджанікідзе, Алтайполіметала, Кемераўскага і інш., скончэнне будаўніцтва Волхаўскага і Дняпроўскага алюмініевых заводаў, будаўніцтва новага алюмініевага Уральскага завода на 25 тыс. тон і Каральскага на 8 тыс. тон, будаўніцтва магніевых, нікілевых і інш. прадпрыемстваў каляровай металургіі.

У галіне хіміі будаўніцтва новых тукавых камбінатаў, заводаў сінтэтычнага каўчука, содавых заводаў, сернакіслотных, гумовых, пластычных мас, анілі і лакафарбавальных, штучнага валакна і т. д.

У лёгкай прамысловасці — будаўніцтва 15 буйных бавоўняна-папяровых прадпрыемстваў, у тым ліку Ташкенцкага, Барнаульскага, Харкаўскага, Чаркуйскага, Закаўказскага бавоўняна-папяровых камбінатаў, магутнасцю па 200 тыс. верацён кожны, будаўніцтва 12 буйных шарсцяных фабрык, магутнасцю ад 8 да 15 млн. метраў тканін кожная, 12 льняных прадпрыемстваў магутнасцю ад 18 да 27 тыс. верацён кожнае, буйных прадпрыемстваў трыкатажнай прамысловасці, 11 шаўковых фабрык, 21 абутковае прадпрыемства магутнасцю ў 100 млн. пар.

У харчовай прамысловасці — скончэнне будаўніцтва 17 мясакамбінатаў, пачатых у першай пяцігодцы, і разгарнуць будаўніцтва 23 новых камбінатаў, будаўніцтва вялікай колькасці цукровых заводаў, 6 мылазварных заводаў, велізарнае павялічэнне флота ў рыбнай прамысловасці, будаўніцтва кансервовых, маслабойных заводаў, кандзітарскіх фабрык і т. д.

У лясной прамысловасці — будаўніцтва вялікай колькасці лесапільных заводаў, лесахімічных прадпрыемстваў і інш.; скончэнне будаўніцтва Камскага і Кандапожскага цэлюлозна-папяровых камбінатаў, Сясьскага цэлюлознага камбіната, будаўніцтва Башкірскага, Краснаярскага папяровых камбінатаў і інш.

Шырокае будаўніцтва і рэканструкцыя тысяч прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці па выробу тавараў шырокага ўжытку, з укладаннем за гады пяцігодкі да 2-х млрд. руб.

У гарадскім будаўніцтве — шырокае разгортванне работ па пераўтварэнню сучасных прамысловых цэнтраў за ўпарадкаваныя гарады; будаўніцтва тысяч дамоў з кватэрамі, абсталяванымі ўсімі выгадамі, агульнай жыллёвай плошчай у 64 млн. кв. метр.; разгортванне работ па планаванню, палепшэнню гарадзкога транспарта, водаспабжэння, каналізацыі, забрукаванню вуліц, азеляненню і т. д.; будаўніцтва дамоў советаў, дамоў тэхнікі, парках культуры і адпачынку, стадыёнаў, тэатраў, клубаў кіно-тэатраў; будаўніцтва ў Маскве Палацу Советаў і першага ў СССР метрапалітэна, першая лінія якога пачне ўступіць у эксплаатацыю ўжо ў 1934 годзе.

16. Намечаная праграма шырокага разгортвання новага будаўніцтва абумаўляе рашучыя крокі ў размяшчэнні прадукцыйных сіл:

а) На аснове развіцця старых прамысловых цэнтраў стварэнне новых асноўных базы індустрыялізацыі ва ўсходніх раёнах Саюза (Урал, Заходняя і Усходняя Сібір, Башкірыя, ДУК, Казакстан і Сярэдняя Азія), інтэнсіўна развіваюць машынабудаўніцтва, металургія, вугаль, нафта, электраэнергія і іншыя галіны прамысловасці. На Усходзе раёны затрачваецца каля паловы ўсіх капіталаўкладанняў, накіроўваемых на новае будаўніцтва цяжкай прамысловасці. У 1937 годзе ўсходнія раёны далуць трэць вытворчасці чыгуна супроць чвэрці ў 1932 г., больш чым трэць здабычы каменнага вугалю супроць чвэрці ў 1932 г., каля адной пятай электраэнергіі (па раённых станцыях) супроць 6,5 проц. у 1932 годзе, дзесятую частку прадукцыі машынабудаўніцтва супроць 5 проц. у 1932 годзе.

б) Завяршэнне будаўніцтва другой вугальна-металургічнай базы Саюза — Урала-Кузнецкага камбіната, на будаўніцтва якога накіроўваецца ў другім пяцігодзьдзі каля чвэрці капіталаўкладанняў у народную гаспадарку СССР і больш адной трэці ўсіх капіталаўкладанняў у цяжкую прамысловасць. Урала-Кузнецкі камбінат павінен даць у 1937 годзе трэць прадукцыі чорнай металургіі, больш чвэрці агульнай вуглездабычы краіны, адной шостай вытворчасці электраэнергіі раённымі электрастанцыямі і каля 10 проц. прадукцыі машынабудаўніцтва.

в) Набліжэнне прамысловасці да крыніц сырцу на аснове развіцця новых раёнаў. Ажыццяўленне буйнейшых зрухаў у размяшчэнні лёгкай і харчовай прамысловасці: з 15 будуючыхся ў 2-м пяцігоддзі бавоўняна-папяровых камбінатаў— 10 намечаны будаўніцтвам у Сярэдняй Азіі, Сібіры і Закаўказзі, што абумаўляе рост вытворчасці бавоўняных тканін па Сярэдняй Азіі амаль у 16 раз пры сярэднім росце па СССР у 2 разы, і стварае моцную базу тэкстыльнай вытворчасці ў гэтых раёнах. Па льняной прамысловасці стварэнне магутных базы пераапрацоўкі ў Заходняй вобласці, у Горкаўскім краі і БССР. Стварэнне новых сыравых базы і ажыццяўленне на іх аснове будаўніцтва новых цукровых заводаў (Заходняя Сібір, Кіргізія, Далёка-Усходні Край, Закаўказзе і т. д.). У асноўных цэнтрах вытворчасці сельскагаспадарчага сырцу разгортванне будаўніцтва скураных, шарсцяных, маслабойных і іншых прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці. У шырокіх размерах расце адабыча мясцовых відаў паліва, якая аслабляе залежнасць раду раёнаў ад дальнямурыўковага апалу.

г) У галіне сельскай гаспадаркі — значны рост зернавой вытворчасці ў асноўных зернавых раёнах, прыступ да работ па пераўтварэнні Заволжжа і стварэння ўстойлівай пашанічнай базы ў цэнтральных і паўночных раёнах, велізарнае павялічэнне прадукцыі тэхнічных культур у асноўных раёнах іх вытворчасці побач са стварэннем новай бурачнай базы на Усходзе, шырокае развіццё новых высокакашчоўных культур, у асаблівасці ў субтропічных раёнах, — забяспечваюць выраўнанне запасу прадуктаў размяшчэння асноўных галін сельскай гаспадаркі і спецыялізацыю раёнаў па культурах і галінах.

д) У галіне транспарта — разам з рэканструкцыяй і ўзмацненнем асноўных транспартных магістралей усходняга і паўднёвага напрамкаў — будаўніцтва вялікай групы новых чыгуначных і водных шляхоў, якія злучаюць новыя і дуструпальныя цэнтры з агульнай транспартнай сеткай Саюза і з'яўляюцца асновай гаспадарчага развіцця новых раёнаў (Карагандa—Балхаш, Уфа—Стэрлітамак, Рубцоўка—Рыдэр, Томск—Чулым, Беламорска-Балтыйскі канал і інш.).

е) Шырокае прамысловае будаўніцтва ў тых, раней у прамысловых адносінах адсталых раёнах, як Сярэдняя Волга, Татарыя, Паўночны Каўказ, ЦЧВ, Закаўказкае, Карэлія, Мурманскі край, Далёкі Усход, Усходняя Сібір і інш., на аснове развіцця ў іх буйнай прамысловасці.

ж) Інтэнсіўнае развіццё будаўніцтва ў галіне асветы, аховы здароўя, мастацтва, друку ў нацыянальных рэспубліках і абласцях.

з) Далейшы рост старых прамысловых раёнаў СССР на аснове паглыблення пачатай у першай пяцігодцы спецыялізацыі і больш роўнамернага ўнутрыраённага размяшчэння прамысловасці.

З'езд адзначае, што ўстанаўляемая праграма размяшчэння прадукцыйных сіл у другім пяцігодзьдзі забяспечвае жыццяздольнасць гаспадаркі і культурнай адсталасці нацыянальных рэспублік і абласцей, больш роўнамернае размяшчэнне прадукцыйных сіл і набліжэнне прамысловасці да крыніц сырцу, спецыялізацыю асноўных раёнаў па сельскагаспадарчых культурах і галінах, завяршэнне эканамічнага раёнавання краіны ў цэлым.

III. ПРАГРАМА ПАВЫШЭННЯ МАТЭРЫЯЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА УЗРОЎНЮ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН

Знішчэнне беспрацоўя і забяспечанасць работай усіх рабочых і служачых пры сістэматычна правадзімым у савецкай дзяржаве палепшэнні ўмоў іх працы, скарочаны да 7 гадзін рабочы дзень і паляпшэнне спрыяючай абстаноўкі для падняцця іх вытворчай кваліфікацыі і агульнага культурнага ўзроўню—усё гэта дае магчымасць усёй масе рабочых і служачых, няўхільна павышаючы прадукцыйнасць працы, больш быстра ісці ўперад па шляху палепшэння свайго матэрыяльнага добрабыту.

Завяршэнне на працягу другой пяцігодкі калектывізацыі ўсёй масы сялянскіх гаспадарак, ліквідацыя кулацтва і падаўленне ўсіх і ўсякіх спроб кулацкага супраціўлення, спыненне расслаення сялянства на заможных і незаможных і знішчэнне ў сувязі з гэтым збяднення і пауперызма ў вёсцы, пры няўхільным арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і быстрым росце іх машына-тэхнічнай базы—усё гэта стварае небывала спрыяючыя ўмовы для быстрага пад'ёму матэрыяльнага ўзроўню калгасна-сялянскай масы, для дасягнення культурнага і заможнага жыцця калгаснікаў і ставіць тэмпы гэтага пад'ёму ў прамую залежнасць ад арганізаванасці і прадукцыйнасці працы саміх калгаснікаў.

У адпаведнасці з гэтым, ухваляючы праект Дзяржплана ў гэтай галіне, з'езд устанаўляе наступныя задачы ў галіне павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця рабочых і працоўных вёскі:

1. а) Рост ліку рабочых і служачых у канцы другой пяцігодкі па ўсіх галінах народнай гаспадаркі на 26 проц., у тым ліку па буйнай прамысловасці на 29 проц.;

б) рост рэальнай заработнай платы ў два разы на аснове канчатковай ліквідацыі паразітычнага спажывання, хуткага росту народнага даходу, павялічэння норм спажывання па такіх прадуктах, як мяса, тлушчы, рыба, яйкі, цукар і промтавары ў 2,5 разы, знішчэння раздробных цэн на 35 проц. і далейшага палепшэння ва ўмовах быту працоўных;

в) рост фонду заработнай платы рабочых і служачых па ўсёй народнай гаспадарцы на 55 проц., у тым ліку па буйнай прамысловасці на 64 проц.;

г) значнае павышэнне дзяржаўных расходаў на культурна-бытавое абслугоўванне рабочых, г. зн. расходаў па сацыяльнаму страхаванню і затрат дзяржавы на асвету, ахову здароўя і культурна-бытавое абслугоўванне рабочых і служачых з 4,3 млрд. руб. да 9,3 млрд. руб.—рост больш чым у два разы за пяцігоддзе;

д) рост ахвату грамадскім харчаваннем рабочых і працоўных горада і вёскі ў два з паловай разы;

е) завяршэнне ў другім пяцігодзьдзі не толькі ліквідацыі нязграматнасці сярод насельніцтва Саюза, ліквідацыі малаграматнасці працаздольнага дарослага насельніцтва і правядзення ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання, але і ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага плітэхнічнага навучання ў аб'ёме сямігодкі, у першую чаргу ў вёсцы, паколькі ў горадзе гэта задача была ў асноўным ужо вырашана на працягу першай пяцігодкі; рост колькасці вучняў (у ніжэйшых і сярэдніх школах, рабфаках, ФЗВ, тэхнікумах, ВНУ, ВТНУ) да 36 млн. чал. супроць 24,2 млн. чал. у 1932 г., або да 197 чал. на тысячу чалавек насельніцтва супроць 147 чалавек, не лічачы дашкольнай асветы, ахапляўшай ужо ў 1932 г. 5,2 млн. чалавек;

ж) шырокае развіццё масавай пазашкольнай работы, цесна ўвязваемай з арганізацыяй культурнага адпачынку працоўных мас, павялічэнне клубнай сеткі ў горадзе і ў вёсцы да 10,9 тыс. супроць 6,8 тыс. (павялічэнне ў гарадах на 10,5 проц., а ў сельскіх мясцовасцях на 130 проц.) і сеткі масавых бібліятэк да 25 тыс. супроць 15 тыс. у 1932 г.;

з) далейшае значнае ўзмацненне работы па ахове здароўя працоўных і, у першую чаргу, шырокае правядзенне санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў, павялічэнне затрат на ахову здароўя, рабочы адпачынак і фізкультуру з 5,4 млрд. руб. у першай пяцігодцы да 19,6 млрд. руб.;

рост больнічных коек у гарадах на 44 проц., у сельскіх мясцовасцях на 98 проц., рост ліку асеньных месц у гарадах на 164 проц., і ў сельскіх мясцовасцях на 129 проц.;

і) павялічэнне за пяцігоддзе ліку гарадоў з водаправодам з 366 да 440; ліку гарадоў з каналізацыяй—з 55 да 125; гарадоў з трамваем—з 50 да 70;

к) у адпаведнасці з гэтым капітальныя ўкладанні ў комунальнае, жыллёвае і культурнае будаўніцтва за другое пяцігоддзе ўстанавіць у размеры каля 32 млрд. руб., або каля чвэрці ўсіх капітальных укладанняў у народную гаспадарку СССР, у тым ліку ў жыллёвае будаўніцтва 13,4 млрд. руб., гарадское комунальнае будаўніцтва—6,2 млрд. руб., асвету —3,1 млрд. руб., ахову здароўя—2,9 млрд. руб.

2. Задача павышэння матэрыяльнага ўзроўню жыцця рабочых і сялян патрабуе ўсямернага разгортвання таваразвароту на аснове павялічэння вытворчасці прамысловых тавараў шырокага спажывання і палепшэння снабжэння горада сельскагаспадарчымі прадуктамі.

У адпаведнасці з гэтым з'езд устанаўляе:

а) рост таваразвароту ў 2 з пал. разы: з 31,9 млрд руб. у 1932 г. да 80 млрд. у 1937 г. (у цэнах 1932 г.) пры павялічэнні вырабу прадметаў шырокага спажывання, выпускаемых лёгкай і харчовай прамысловасцю, у 2 з пал. разы;

б) рост раздробнай дзяржаўна-кааперацыйнай гандлёвай сеткі на 37 проц. з адначасовым правядзеннем яе тэхнічнай рэканструкцыі;

в) зніжэнне сярэдняга ўзроўню раздробных цэн супроць 1933 г. на 35 проц.

3. З'езд устанаўляе рост народнага даходу з 45,5 млрд. руб. да 100 млрд. руб., або ў 2,2 раза, і рост фонда спажывання ў народным даходзе ў 2,4 раза пры адначасова велізарным росце накаплення у аграмаджанай гаспадарцы, а таксама росце дзяржаўных рэзерваў.

З'езд падкрэслівае, што асновай дзяржаўнай дзейнасці павінна быць барацьба за ўкараненне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі, узмацненне планава-фінансавай дысцыпліны, далейшае ўмацаванне савецкага рубля—гэтага важнейшага вагара ўзмацнення гаспадарчага разрахунку і ўмацавання эканамічных сувязяй паміж горадам і вёскай.

XVII з'езд ВКП(б) устанаўляе, што другі пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі, прадстаўлены Дзяржпланам Саюза і прыняты ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР, забяспечвае:

а) ліквідацыю капіталістычных элементаў і класаў наогул, канчатковую ліквідацыю, на аснове поўнага завяршэння калектывізацыі сялянскіх гаспадарак і кааперавання ўсіх саматужнікаў, прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці; ліквідацыю многаукладнасці эканомікі Совецкага Саюза і ўстанаўлення соцыялістычнага спосабу вытворчасці, як адзінага спосабу вытворчасці, з пераўтварэннем усяго працоўнага насельніцтва краіны ў актыўных і свядомых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства;

б) завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі СССР на базе, якая створана ў перыяд першай пяцігодкі і ідзе па шляху далейшага шпаркага пад'ёму прамысловасці, стваральнай сродкі вытворчасці (цяжкай прамысловасці);

в) больш быстры пад'ём добрабыту рабочых і сялянскіх мас і пры гэтым рашучае палепшэнне ўсёй жыллёвай і комунальнай справы ў СССР;

г) умацаванне эканамічных і палітычных пазіцый пролетарскай дыктатуры на аснове саюза рабочага класа з сялянствам для канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў і класаў наогул;

д) далейшае ўмацаванне абароназдольнасці краіны.

Ажыццяўленне гэтых задач, вядучае да выяснення апошніх астаткаў капіталістычных элементаў з усіх іх старых пазіцый і асуджаючае іх на канчатковую гібель, не можа не выклікаць абвастрэння класавай барацьбы, новых спроб падрыву калгасаў з боку кулацтва, спроб шкодніцкага сабатажу нашых прамысловых прадпрыемстваў з боку антысовецкіх сіл. З другога боку, ажыццяўленне задач другой пяцігодкі, пяцігодкі карэннага пад'ёму жыццёвага ўзроўню рабочых і сялянскіх мас на аснове завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, не можа не выклікаць энтузіязма працоўных, прыліву вытворчай актыўнасці і ўзрастаючага імкнення да асваення новай тэхнікі ў найшырэйшых масах працоўных — будаўнікоў соцыялізма.

Бязлітасна громячы контрраволюцыйныя вылазкі класавага ворага і згуртоўваючы рады ўдарнікаў соцыялізма для пераможнага выканання другога пяцігадовага плана, рабочы клас разам з калгаснымі масамі, пад кіраўніцтвам партыі, вядучай няўхільную барацьбу з усякім апартунізмам, пераможа ўсе і ўсякія труднасці на шляху будаўніцтва соцыялізма.

XVII з'езд ВКП(б) указвае, што выкананне другога пяцігадовага плана, плана агульнай тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, патрабуе такой арганізацыі справы, пры якой былі-б забяспечаны:

папершае, аператыўнасць і канкрэтнасць штодзённага гаспадарчага кіраўніцтва, якое не мірыцца з бюракратычнымі скажэннямі ў гаспадарчым апараце;

падругое, сканцэнтраванне лепшых інжынерна-тэхнічных сіл на рашаючых вытворчых участках, а не ў канцылярыях устаноў;

патрэцяе, правільная арганізацыя заработнай платы рабочых, забяспечваючая матэрыяльнае зацікаўленне росту прадукцыйнасці працы;

пачацвертае, падняцце справы соцыялістычнага спаборніцтва, асабліва ў цэхах, лепшага асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцяй;

папятае, моцная вытворчая дысцыпліна як у прамысловых прадпрыемствах і соўгасах, так і ў калгасах;

пашостае, рэволюцыйная пільнасць супроць ворагаў і дыктатуры пролетарыята і сапраўдная адказнасць перад рабочым класам і яго партыяй за даручаную справу;

пасёмае, далейшае ўмацаванне саюза рабочых і працоўных сялян.

У другім пяцігодзьдзі СССР ажыццяўляе буйны крок наперад у справе зжывання векавой процілегласці чалавечага грамадства — процілегласці паміж горадам і вёскай — і стварае ўсе неабходныя прадпасылкі для знішчэння гэтай процілегласці. Па сваёй грамадскай форме сельская гаспадарка становіцца адпаўшчай з прамысловасцю, сельскагаспадарчая праца ператвараецца ў рознавіднасць працы індустрыяльнай, магутна ўзрастаюць транспартныя сувязі паміж горадам і вёскай, значна зближаюцца тэмпы росту вытворчасці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, зближаюцца ўзроўні матэрыяльнага добрабыту і культуры працоўных горада і вёскі.

СССР ператвараецца ў другім пяцігоддзі ў тэхніка-эканамічна-не залежную краіну і ў самую перадавую ў тэхнічных адносінах дзяржаву ў Еўропе.

Выкананне другой пяцігодкі яшчэ больш узмоцніць значэнне СССР, як аплота барацьбы міжнароднага пролетарыята, яшчэ вышэй падыме ў ачах працоўных эксплаатуемых мас усяго свету аўтарытэт краіны Советаў, як апорнай базы сусветнай пролетарскай рэволюцыі. Новыя вялікія гістарычныя перамогі ў будаўніцтве соцыялізма яшчэ больш умацуюць эканамічную аснову баявой магутнасці Совецкага Саюза, яго здольнасць адбіць і сакрушыць любыя замахі ворагаў пролетарскай дзяржавы. Магутны гаспадарчы пад'ём і няўхільны рост добрабыту працоўных мас СССР пры крызісе ў капіталістычных краінах яшчэ ярчэй пацвердзяць перавагі соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі перад капіталістычнай і гістарычную асуджанасць сістэмы капіталістычнага рабства, яшчэ паўней выявяць гіганцкія творчыя сілы рэволюцыйнага пролетарыята, заваяваўшага ўладу і ўмацоўваючага сваю дыктатуру ў гераічнай барацьбе за пабудову бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

XVII з'езд ВКП(б) патрабуе ад усіх членаў партыі большэвіцкай барацьбы за перамогу другога пяцігадовага плана і заклікае рабочых і калгаснікаў згуртавацца вакол партыі для выканання гэтай гістарычнай задачы.

ЖОРСТКІЯ БАІ РАБОЧЫХ АЎСТРЫІ З ФАШЫСТАМІ

БАРАЦЬБА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ВАРШАВА, 14 лютага. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Вены, і пасля паўдня з выключнай жорсткасцю прадаўжаліся баі паміж войскамі і рабочымі.

Урад звярнуўся па радыё да жовак рабочых-шуцбундаўцаў, утаварыючы іх перакананць сваіх мужэй спыніць барацьбу. Урад заклікае ад начасова па радыё ўсіх афіцэраў заняцца і спартсменаў у якасці добраахвотнікаў з'явіцца заўтра на зборны пункт для ўдзелу ў барацьбе супроць рабочых.

Дакладны лік забітых у баях рабочых яшчэ невядомы. Але, паводле ўсіх даных, каля 1.500 забіта і ранена некалькі сот паліцэйскіх і салдат.

Вена ў агні паўстання

У Вене неапісуемае ўзбуджанне. Увесь час раздаюцца выстралы і чуцен шум пранелераў паліцэйскіх самалётаў.

К 6 гадзінам вечара барацьба адваніцца нанет у тых комунальных домах, якія былі ўчора ўвечары і сёння раніцою ўзяты войскамі. У той час, як афіцыяльнае паведамленне гаворыць аб «спыненні супраціўлення» ў доме Карла Лібкнехта ў раёне Фаворытэн, барацьба там прадаўжаецца. Дом з усіх бакоў акружан войскамі.

У раёнах Мейдлінга і Флорыдсдорфа рабочыя створаны камітэты абароны, якія ўначаліваюць арганізаванае супраціўленне. У склад камітэтаў уваходзяць сацыял-дэмакратычныя рабочыя і комуністы.

Забастоўка чыгуначнікаў

Паведамляюць аб сур'ёзных перабоях у чыгуначным руху з прычыны забастоўкі чыгуначнікаў на многіх лініях.

У Вене ваенна-палявы суд прыгаварыў да кары смерцю праз павешанне рабочага шаўца, члена шуцбунда Мюнгхройтэра за ўдзел у бою ў раёне Гітцынга. Мюнгхройтэр быў трывожаны ў суд цяжка раненым з больніцы. Судовы доктар заявіў, што «абшчаваны, не гледзячы на цяжкія раны, з пункту гледжання закона не можа разглядацца як пяк ка хворы». Мюнгхройтэр павешан. Ваенна-палявыя суды пачалі дзейнічаць таксама ў іншых гарадах.

Роспуск рэфармісцкіх профсаюзаў

Урадам абгрунтавана аб роспуску па всей Аўстрыі ўсіх рэфармісцкіх профсаюзаў, а таксама спартыўных і фізкультурных арганізацый. Памяшканні профсаюзаў апячатаны.

Артылерыйскі абстрэл рабочых

ВЕНА, 14 лютага. (БЕЛТА).

Аўстрыйская агенцтва паведамляе, што рабочы дом у Венскім раёне «Флорыдсдорфе ўзят штурмам пасля абстрэлу гаўбіцамі. Заняты рабочымі заказал у Флорыдсдорфе таксама захоплен войскамі пасля доўгай артылерыйскай падрыхтоўкі.

У пролетарскім квартале Эдэрэсе, які знаходзіцца ў гэтым-жа раёне, войскі і хеймвераўцы атрады перайшлі ў наступленне на заняты рабочымі будынак раённага мунісіпалітэта. У гэтым раёне, а таксама ў Зімерынгу, войскі, як гаворыцца ў афіцыяльным паведамленні, апярыруюць «усімі сродкамі сучаснай ваеннай тэхнікі», каб «бязлітасна ламаць» супраціўленне рабочых.

ГЕРАІЗМ ВЕНСКІХ РАБОЧЫХ

БЕРЛІН, 15 лютага. (БЕЛТА).

У прошламу афіцыяльным аўстрыйскім паведамленням, паведамленні раніпніх берлінскіх газет з Вены сведчаць аб прадаўжаючайся гераічнай барацьбе рабочых.

Бесперапынная канонада

Газеты падкрэсліваюць, што дротавыя загароды яшчэ не ўзраны, і ўсе банкі і ўрадавыя ўстановы ў цэнтры горада ахоўваюцца кулямётнымі атрадамі. Увесь дзень учора кулямётная стральба ў прадмесцях Вены чаргавалася з артылерыйскім агнём.

Згодна некаторых вестак, колькасць забітых у Вене дасягнула 1.300 чалавек. Баявыя сілы гераічна супраціўляючыхся рабочых падтрымліваюцца іх сем'ямі, а таксама рабочымі, не ўцягнутымі непасрэдна ў баі. Карыстаючыся цемнатой, рабочыя з небяспекай для ўласнага жыцця снабжаюць байцоў харчамі і амуніцыяй.

Рабочыя не здаюцца

К вечару становішча прадстаўлялася ў наступным выглядзе: у Гейлігенштадце (19 раён) вялася прыгарадных зносін, многа раз на працягу апошніх трох дзён пераходзілі з рук у рукі, поўнасцю разбуран. Велізарны блок дамоў імя Карла Маркса, які знаходзіцца па суседству з вакзалам, таксама большай часткай разбуран, але і ў разбураных домах рабочыя прадаўжаюць супраціўляцца. Пад руінамі — многа забітых, сярод іх жанчыны і дзеці.

Акопы ў кварталах Вены

Рабочыя моцна трымаюць у руках Лаэрберг, не гледзячы на тое, што радыёстанцыя, якая там знаходзіцца, занята войскамі. Рабочыя дружыны вырылі тут акопы. Раён Флорыдсдорфа, які падпадаў найбольш доўгаму артылерыйскаму абстрэлу, таксама ў значнай частцы знаходзіцца ў руках рабочых.

Адказ на ўльтыматум урада

Ва ўчарашніх баях у Вене войскамі ўзята ў палон 800 членаў шуцбунда. Блок мунісіпальных дамоў імя Гетэ ў раёне Леопольдштадт (Вена) утрымліваецца рабочымі і прадстаўляе сабой важную стратэгічную пазіцыю, пануючую над мастом праз Дунай. Увечары баі за гэты блок дамоў узмацніліся. Войскі шалверлі блок доўгаму артылерыйскаму абстрэлу, у рэзультаце якога ўзнік пажар.

Згодна паведамлення «Дэйчэ альгемейне цайтунг», займаючыя дом рабочыя і шуцбундаўцы адхілілі ультыматыўнае патрабаванне адыйсці і яшчэ больш узмацнілі супраціўленне.

Раёны Зімерынг і Нейдлінг таксама ў большай сваёй частцы знаходзяцца ў руках рабочых. У раёне Оттакрынгу баі прадаўжаюцца. Рабочыя трымаюць у сваіх руках акружаючыя Вену з поўдня прадмесці Лаінг, Верндорф, прамысловы горад Баден і суседні курорт Баден, прамысловыя цэнтры на лініі Паўднёвай чыгункі Вінерайштадт, Нейкірхен, Берндорф і Глогніц. У руках рабочых знаходзяцца чыгуначныя лініі, якія вядуць з Вены ад вакзала Аспарн і ад уходнага вакзала ў Вентрыю, і лінія, якія вядуць у Чэхаславакію (ад Паўночнага вакзала і вакзала Францы Іосіфа).

Упартыя баі ў правінцыі

У правінцыі таксама прадаўжаюцца гераічныя ўпартыя баі. Войскам і мабілізаваным пад кіраўніцтвам Штаразберга асобным атрадам хейм вера, не гледзячы на несупынны артылерыйскі абстрэл, не ўдалося ўзяць верхня-аўстрыйскі горад Штэйр, які заранейшаму знаходзіцца ў руках рабочых. У рэзультаце артылерыйскай стральбы хеймвераўскім атрадам удалося ўварвацца толькі ў прадмесце Штэйра — Энсляйтан. Рабочыя астаюцца гаспадарамі буйнейшай фабрыкі зброі «Штэйрверке».

У той час, як афіцыяльныя аўстрыйскія паведамленні сцвярджалі, нібыта ў Лінцы супраціўленне рабочых перамоскала, выявятляецца, што пролетарскі раён горада Лінца Урфар, размешчаны на ўзгорках левага берага Дуная, знаходзіцца ў руках рабочых і становіць сабой моцную стратэгічную пазіцыю, пануючую над мастамі праз Дунай. На сушнабудаўнічых верфях у Лінцы адмаўліліся баі. Таксама прадаўжаецца барацьба ў прадмесці Лінца Фрыдберту.

У прамысловых раёнах Штырыі скансцэнтравана вялікая колькасць узброеных рабочых. Паміж Венай і Штырыяй усялякая сувязь перарвана. Чакаюцца новыя жорсткія баі. У Эгенбурку (каля Граца) рабочыя атакавалі і захапілі штурмам казармы жандармерыі і паліцыі і адступілі толькі пасля жорсткіх баёў, калі ў дапамогу жандармам падасперлі буйныя егерскія часці. Налічваюць 50 забітых. У Брукк-на-Муры важнейшыя стратэгічныя пункты зноў перайшлі ў рукі шуцбундаўцаў. Імі камандуе с.-д. дэпутат — б. старшыня совета рабочых дэпутатаў у 1919 годзе ў совецкай Венгрыі Валіш.

Згодна апошніх паведамленняў германскага інфармацыйнага бюро, урадавыя войскі ў адной толькі Вене ўзялі ў палон на працягу ўчарашняга дня 2.000 рабочых і шуцбундаўцаў. Сярод забітых многа жанчын. Як паведамляе інфармбюро, ра большыя і жоны рабочых прымалі актыўнейшы ўдзел у баях.

Германскія газеты адзначаюць, што на заплыі урада да былых салдат — удзельнікаў імперыялістычнай вайны — прыняць добраахвотны ўдзел на баку войск у барацьбе супроць рабочых нічто з рабочых — былых салдат не адпіхнуўся.

АРТЫЛЕРЫЯ ЗНІШЧЫЛА ЦЭЛЫЯ РАБОЧЫЯ КВАРТАЛЫ

ПРАГА, 15 лютага. (БЕЛТА).

Паступіўшыя з Вены раніцою першыя афіцыяльныя паведамленні сведчаць, што баі ў Вене прадаўжаліся і ноччу з 14-га на 15-е лютага.

У 11 гадзін вечара канцлер Дольфус звярнуўся з «апошнім заклікам» да венскіх рабочых спыніць супраціўленне.

«Усе, — заявіў Дольфус, — хто з 11 гадзін вечара ўстрымаецца ад процідзеяння ўладам і да 12 гадзін наступнага дня (г. зн. 15 лютага) добраахвотна з'явіцца да прадстаўнікоў улады, могуць разлічваць на міласць, за выключэннем адказных важакоў».

Учора ноччу ўрад пад уражаннем абурэння грамадскай думкі за границай артылерыйскім абстрэлам комунальных жылых дамоў, знайшоў патрэбным выдаць афіцыяльнае паведамленне.

У гэтым паведамленні ўрад справедліва «апраўдаць» бязлітаснае знішчэнне артылерыйскім агнём цэлых рабочых кварталаў тым, што «выключна моцна пабудаваныя комунальныя дамы прадстаўлялі нешта накшталт крэпасці і маглі быць узяты толькі з дапамогай артылерыйскага агня».

Венскія карэспандэнты венгерскіх урадавых газет паведамляюць, што арыштован уладамі таксама начальнік штаба аўстрыйскага шуцбунда былы генерал і зараз сацыял-дэмакратычны член сакзнага совета (верхняй палаты) Кернер.

За галаву дэпутата Каламана Вал лічэ — кіраўніка шуцбунда ў Брукк-на-Муры, дзе рабочыя аказалі ўрадавым войскам выключна ўпартае супраціўленне, урад назначыў грашовую прэмію.

ВОДГУКІ НА ПАДЗЕІ У АЎСТРЫІ

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 14 лютага (БЕЛТА).

Буржуазны друк у паведамленнях з Аўстрыі адзначае баявы дух рабочых, якія прадаўжаюць аказваць войскам і фашыстам жорсткае супраціўленне. Газеты адзначаюць таксама, што новыя масы рабочых далучыліся да барацьбы.

Венскі карэспандэнт «Морнінг пост» указвае, што рабочыя члены шуцбунда праяўляюць здзіўляючую адвагу і што «іх запасы зброі і боепрыпасаў здаюцца невычарпальнымі». Ён дадае, што афіцыяльны бюлетэнь аўстрыйскага ўрада пераўмяшае труднасці, якія стаяць перад урадавымі войскамі.

Згодна паведамлення карэспандэнтаў «Дэйлі мэйль» і іншых газет, ноччу ў радзе раёнаў Вены рабочыя аднавілі наступленне. Паводле слоў карэспандэнта «Дэйлі мейл», у часе баёў у пасольскім квартале жанчыны скідалі з акон на хеймвераў распаленыя вугалі.

Як паведамляе карэспандэнт «Дэйлі экспрэс», урадавыя войскі былі засцігнуты знянацку паўночнай атакай, прадпрынятай рабочымі ў 20 раёнах горада. Робіць уражанне—піша ён—што войскі стаміліся біцца. Міністру абароны прышлося звярнуцца за дапамогай к былым удзельнікам вайны.

Як паведамляе карэспандэнт «Н'юс хронікл», рабочыя ноччу адзавілі наступленне ў Флорыдсдорфе, Мейдлінгу, Зімерлінгу і Дэблінгу, прычым у гэтым наступленні прынялі ўдзел батальёны ўзброеных рабочых з прамысловага прадмесця Вены горада Штадмау. Як паведамляюць, рабочыя прадаўжаюць трымаць у сваіх руках ад прамысловых цэнтраў у правінцыі, у тым ліку Вінер-Нэйштадт, Капфенберг, Юдэнбург і інш. Некаторыя карэспандэнты перадаюць чуткі, што з некаторых цэнтраў ідуць падмацаванні венскім рабочым.

Кансерватыўны друк, каментуючы ў раздражнёным тоне падзеі ў Аўстрыі, ставіць Дольфусу ў прыклад Гітлера.

«Морнінг пост» публікуе гутарку свайго мюнхенскага карэспандэнта з адным блізкім супрацоўнікам Габіхта (галоўнага інструктара нацыянал-сацыялістаў па аўстрыйскіх справах). Ён заявіў карэспандэнту, што аўстрыйскія нацыянал-сацыялісты гатовы аказаць падтрыманне ўраду Дольфуса пры ўмове, што ім прадаставяць два міністэрскіх пасты — міністра ўнутраных спраў і міністра безапаснасці.

Сярод англійскіх рабочых падзеі ў Аўстрыі выклікалі вялікае ўзбуджэнне. Учора на мітынгу ў Іст-Эндзе (Лондан) была выбрана дэлегацыя, якая прабавала пранікнуць у аўстрыйскае пасольства і заявіць пратэст. Дэлегаты не былі прапушчаны ў будынак паліцыяй. Лейбарысцкая партыя і кангрэс трэд'юніонаў апублікавалі маніфест, у якім падкрэсліваюць, што рабочыя былі справакаваны аўстрыйскім урадам, і заклікаюць збіраць сродкі ў фонд дапамогі аўстрыйскаму рабочаму класу. Генеральны сакратар кангрэса трэд'юніонаў Сітрын выехаў раніцою ў Парыж на надзвычайнае пасяджэнне Амстэрдамскага інтэрнацыянала. Незалежная рабочая партыя звярнулася да лейбарысцкай партыі, кангрэса трэд'юніонаў, комуністычнай партыі, кааперацыйнай партыі і да «соцыялістычнай лігі» з прапановай стварыць адзіны фронт для падтрымання рабочых Аўстрыі і іншых краін.

ЦК комуністычнай партыі Англіі апублікаваў маніфест, у якім заклікае рабочых арганізаваць масавыя дэманстрацыі ў абарону аўстрыйскіх рабочых ва ўсіх гарадах. ЦК заклікае наладжваць дэманстрацыі пратэсту каля аўстрыйскіх консульстваў. Орган компартыі «Дэйлі уоркер» выкрывае такты с.-д. лідэраў, якія ўтрымлівалі рабочых ад наступлення перад узрастаючай фашысцкай небяспекай.

ЗША

ДЭМАНСТРАЦЫІ САЛІДАРНАСЦІ

Н'Ю-ЙОРК, 14 лютага (БЕЛТА).

Больш 500 рабочых пад кіраўніцтвам компартыі дэманстравалі сёння супроць фашысцкага тэрора ў Аўстрыі перад будынкам аўстрыйскага консульства Н'ю-Йорка. Дэманстранты, сярод якіх былі і члены соцыялістычных арганізацый, прымусілі паліцыю дапусціць да консула дэлегацыю з складзе прадстаўнікоў компартыі Майнора, Джэмса Форда і Цэйтац.

Рабочыя аказалі супраціўленне спробам паліцыі рассеяць дэманстрацыю. Прыбыўшая конная паліцыя, узброеная дубінкамі, атакавала дэманстрантаў. Майнор, Форд і многія іншыя рабочыя, а таксама адзін паліцэйскі былі ранены. Рабочыя дэманстравалі са сцягамі і плакатамі, агалашаючы лозунгі: «Няхай жыве совецкая Аўстрыя», «Далоў Дольфуса», «Далоў фашызм».

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 14 лютага (БЕЛТА).

ЦК компартыі і комсамол Чэхаславакіі выпусцілі адозву да комуністычных і соцыял-дэмакратычных рабочых з заклікам правесці 16-га сумесную дэманстрацыю і за бастоўку салідарнасці з паўстаўшымі аўстрыйскімі рабочымі.

ПАГІБЕЛЬ „ЧЭЛЮСКІНА"

ПАЛЯРНАЕ МОРА, 13 лютага. (БЕЛТА).

13-га лютага ў 15 гадзін 30 мінут за 155 міль ад мыса Паўночнага і 144 мілі ад мыса Уэллоэн «Чэлюскін» затануў, раздаўлены льдамі.

Ужо апошняя ноч была трывожнай з-за частых сціскання і моцнага тарашэння ільду. 13-га лютага ў 13 гадзін 30 мінут раптоўным моцным напорам разарвала левы борт на вялікім працяжэнні: ад на савога трума да машыннага аддзялення. Адначасова лопнулі трубы параправода, што пазбавіла магчы масці пусціць водаадліўныя сродкі, дарочы бескарысныя з прычыны велічыні цечы.

Праз 2 гадзіны ўсё было кончана. За гэтыя дзве гадзіны арганізавана, без адзінага праяўлення панікі выгружаны на лёд даўно падрыхтаваны аварыйны запас харчоў, палаткі, спальныя мяшкі, самалёт і радыё. Выгрузка прадаўжалася да таго моманту, калі нос судна ўжо пагрузіўся пад ваду. Кіраўнікі экіпажа і экспедыцыі зышлі з парахода апошнімі за некалькі секунд да поўнага пагружэння. Спрабуючы сыйсці з судна, загінуў загадчык гаспадаркі Магілевіч. Ён быў прыціснут бервяном і ўцягнут у ваду. Астатнія цэлы і здаровы. Жывем у палатках, будуем дзераўяныя баракі. У кожнага — спальны мяшок, механая адзежа.

Просім родных не непакоіцца, не пасылаць запытанняў, — мы эканомім акумулятары і не можам даваць частых тэлеграм. Звязаліся з радыёстанцыямі Уэллоэна і мыса Паўночнага, адкуль будзе арганізавана дапамога самалётамі і сабакамі. Настрой ва ўсіх бадзёры.

Запэўняем урад, што пяшчасце не спыніць нас у рабоце па канчатковаму асваенню арктыкі, па пракладцы Паўночнага морскага шляху.

Начальнік экспедыцыі **ШМІДТ.**

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ДАПАМОГІ УДЗЕЛЬНІКАМ ЭКСПЕДЫЦЫІ тав. ШМІДТА О. Ю. І КАМАНДЗЕ ЗАГІНУЎШАГА СУДНА „ЧЭЛЮСКІН"

ПАСТАНОВА СНК СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Для арганізацыі дапамогі ўдзельнікам экспедыцыі тав. Шмідта О. Ю. і камандзе загінуўшага судна «Чэлюскін» стварыць урадавую камісію ў наступным складзе: нам. старшыні СНК СССР тав. Куйбышэў В. В. (старшыня), тав. Янсон Н. М. (наркамвод), тав. Каменеў С. С. (нам. наркамваенмора), тав. Уншлігт І. С. (нач. Галоўпаветрафлота), тав. Іоффе С. С. (нам. нач. ГУСМП).

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўн. спраў Сов. Нар. Камісараў Саюза ССР
І. МРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль. 14 лютага 1934 г.

Усеагульная стачка ва Францыі

ПАРЫЖ, 14 лютага. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Юманітэ», заба стоўка 12-га лютага шырока ахапіла ваенныя заводы, арсеналы і прадпрыемствы ваеннай прамысловасці. Баставалі поўнасцю ўсе рабочыя аружэйных майстэрняў у Тылі, усе рабочыя парахавога завода Сен-Шама і завода зброі ў Руель, на ваенных прадпрыемствах у Буржэ, у Арсантэрэй баставала 60 проц. усіх рабочых. На авіяцыйным заводзе, які выпускае бомбавозы, баставалі 100 проц. рабочых, на заводзе авіяцыйнага маторабудаўніцтва — 80 проц., на заводзе штучнага шоўка — 100 проц., на кулямётным заводзе Гочкуса баставала 85 проц. рабочых, ваенны завод у Іўры быў таксама закрыт.

На чыгуначным транспарце з прычыны сабатажа рэфармісцкіх лідэраў усеагульная забастоўка не ўдалася, але тым не менш чыгуначнікі Парыжскай вобласці спынілі работу ва ўсіх дэпо на 15 мінут і правялі мітынгі, на якіх выставілі свае патрабаванні. На радзе чыгуначных прадпрыемстваў работа была спынена на гадзіну.

Дадатковыя даныя, атрыманыя аб дэманстрацыях, сведчаць аб велізарнай перамозе адзінага фронта. У Марселі ў дэманстрацыі прымала ўдзел 100 тыс. чалавек, у Тулоне — 30 тыс., у Брэсце — 12 тыс., у Кале — 25 тыс., у Тулузе — 30 тыс., у Руане — 10 тыс., у Машпельє — 10 тыс., у Ніцы — 10 тыс., у Німе — 8 тыс. і т. д.

У Валанс'ене баставаўшыя рабочыя абараняліся глыбамі вугалю ад насядаўшых на іх жандармаў. У Тулоне дэманстранты прымусілі паліцыю вызваліць некалькі арыштаваных рабочых. Налічваецца многа раненых. У Брэсце дэманстранты прымусілі вызваліць паліцыю трох арыштаваных рабочых. У Бульонь-сюр-Мэр у часе сутычкі з паліцыяй ранена 4 рабочых, арыштавана 12. У Кале бастуючыя рабочыя захапілі будынак цэнтральнай тэлефоннай станцыі, чыгуначнае дэпо і наладзілі дэманстрацыю перад салдацкай казармай. У Авіньёне дэманстранты таксама праходзілі міма казарм з прывітальнымі выгукамі.

У Дзюнкірхене папраўчы трыбунал прыгаварыў трох работнікаў унітарных прафсаюзаў да 6 месяцаў зняволення, а сакратара ўнітарнага прафсаюза докераў — да 3-х месяцаў за ўдзел у сутычцы з штрэйкбрэхерамі. Унітарныя прафсаюзы пастанавілі аб'явіць сёння 24-гадзінную забастоўку докераў у знак пратэста супроць прыгавора суда.

У Парыжы сёння адбыўся 8-тысячны мітынг шоферaў таксі, бастуючых 14-ты дзень. Пасля дакла да дэлегацыі, гутарыўшай з міністрам працы Марке (неасоцыяліст), сход пастанавіў прадаўжаць забастоўку да канчатковай перамогі. Рэфармісцкія лідэры прадпрымаюць за спіной стачкома розныя махінацыі з мэтай сарваць забастоўку.

***

За апошнія 6 дзён з 7-га па 13-га лютага, орган компартыі «Юманітэ» меў агульны тыраж звыш 3 млн. экз. 13-га лютага тыраж «Юманітэ» быў рэкордны за ўвесь час існавання газеты — 642 тыс. экземпляраў.

РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

У ПАГОНІ ЗА ПРЭМІЯМІ

Першай у БССР закончыла рамонт трактароў **Буда-Кашалеўская МТС.** Аб гэтым яна рапартавала ў дні XV з'езда КП(б)Б. МТС атрымала ад Наркамзема 1.000 руб. для прэміявання лепшых рабочых. Кіраўнікі МТС чакаюць, ніяк дачакацца не могуць, пакуль Наркамзем і іх прэміруе. За такую пасляховую работу Наркамзем абяцаў прэміраваць легкавым аўтамабілям.

Перш чым выдаць прэмію Наркамзем зацікавіўся праверыць, як МТС адрамантавала свае трактары. Што-ж аказалася пры праверцы?

З 20 адрамантаваных «фардзонаў» для 11 былі атрыманы новыя калёсы, гатыя валы. Для астатніх 9 валы адрамантавала сама МТС. Усе 9 адрамантаваных валаў маюць конуснасць і эліпснасць шырэй 0,06 — 0,08 мм., адзін вал мае нават 0,15 мм. Між тым, як максімум, які дапускаецца для валаў — 0,015 мм. Такім чынам, усе адрамантаваныя МТС валы аказаліся нягоднымі.

Ёсць шмат выпадкаў нездавальняючай заліўкі падшыпнікаў. У некаторых падшыпніках забіт заліт вельмі тоўстым пластом. Расточка падшыпнікаў, асабліва шатунных, недакладная. Разцы ўстанаўляюцца на вока, рэдка дзе расточка адпавядае шыйцы вала. З прычыны неакуратнай падгонкі падшыпнікаў прыжыр цягнецца каля 2 гадзін, і верхні слой бабіта перапаль ваецца.

Карацей кажучы, пры праверцы аказалася, што ўсе адрамантаваныя маторы маюць такую вялікую колькасць буйных дэфектаў, што іх нанава трэба разабраць і рамантаваць. Пры праверцы двух «фардзонаў» аказалася, што яны ледзь могуць выцягнуць 15 конскіх сіл, у той час як яны павінны даць не менш 20.

Галоўная прычына нізкай якасці рамонту маторaў заключаецца ў тым, што на МТС поўнасцю адсутнічае тэхнічны кантроль, маторы фактычна прымаліся «на вока». У пагоні за прэміяй дырэкцыя МТС зусім ігнаравала якасць рамонта. Ні адзін матор правільна не адрэгуліраван. У адным трактары «ХТЗ» аказаўся нават пяспраўны рэгулятар зваротаў матора. За мест 595 зваротаў у мінуту шкіў пры праверцы даваў 1.000.

У МТС нават не паклапаціліся як след прачысціць маторы. У картэрах маторaў поўна пяску. Кіраўнікі майстэрні апраўдваюцца тым, што ад пяску ніяк нельга пазбавіцца. У сапраўднасці-ж бочкі з маслам ляжаць на складзе проста на пяску. Пры наліўцы масла з бочкі ў вядро, туды пападае і пясок, які потым забіраецца ў цылінды, падшыпнікі, што дрэнна адбіваецца на рабоце матора.

Нізкая якасць рамонту маторaў у Буда-Кашалеўскай МТМ павінна паслужыць сігналам для ўсіх МТМ і МТС БССР. Трэба ўсюды праверыць адрамантаваныя маторы. Наркамзем павінен разасласць у раёны ўсіх спецыялістаў з апарата, для таго, каб, арганізаваўшы на месцы патрэбны тэхнічны кантроль, забяспечыць высокую якасць рамонту, добрую работу трактароў на слябе.

Кожны трактар, вышаўшы з капітальнага рамонту, павінен мець магутнасць матора не меншую чым мае новы трактар.

А. С.

Нагрузіць Рагачоўскую МТМ!

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО,
Палітсектару НКЗ—т. РАТНЕКУ,
Наркамзему—т. БЕНЕКУ, „ЗВЯЗДЗЕ"

Рагачоўская МТМ закончыла рамонт трактароў. Замест 157 паводле плана адрамантавана 160 трактароў і маторaў. Сход рабочых пастанавіў адрамантаваць дадаткова 25 адзінак іншых МТМ. Чакаем тэрміновага ўказання.

Сакратар РК КП(б)Б ГЕУРАСЕЎ.
Начальнік палітаддзела ВАЙМАН.
Дырэктар МТМ САЎЧАКОЎ.

У СОУНАРКОМЕ БССР

14 лютага ў новай зале СНК у Доме ўрада пад старшынствам тав. Гікалэ адбылося гарнавае пасяджэнне СНК БССР.

Было разгледжана пытанне аб народна-гаспадарчым плане 1934 года ў раённым разрэзе.

Для ўдзелу ў абмеркаванні гэтага пытання былі выкліканы тры старшыні горсоветаў — Менску, Гомеля і Віцебска, і 12 старшынь раённых канкомаў.

Аб ходзе перасялення ашчадкасы № 16 з дома адведзенага для арганізацыі універмага

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: за праўленую калегіяльную і высакатэхнічную пастановы Камісіі тав. Лычова і СНК аб ослабленні вайсеемага ашчадкасай № 16 памяшкання і перасялення яе ў адведзенае ёй новае памяшканне, за прадстаўленне раздутай, рэзаўкай заяўкі на расходы па пераезду і неправільнае падрыхтоўчых работ па перасяленню, запатрыкаў Цэнтральнай ашчадкасы тав. Кавалю абвясціць суровую вымову з пазбаўленнем, а начальніку Галоўнага кіраўніцтва ашчадкасамі тав. Вершэўскаму абвясціць вымову з апублікаваннем у друку.

Нам. старшыні СНК БССР
А. БАЛІЦІН.
Нам. кіраўніка спраў СНК БССР
А. МАЦКО.

8 лютага, 1934 г.

ХРОНІКА

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ ударнікаў-ударнікаў склікаецца 1-га сакавіка. Чакаецца прыезд каля 500 дэлегатаў. Злёт працягнецца 3-4 дні.

РАБОЧЫЯ КАФЕ адкрываюцца на заводах «Комунар», імя Варашылава і фабрыцы «Окцябр» у Менску.

НОВЫ АНТЫРЭЛІГІЙНЫ АДДЗЕЛ адкрыўся пры Беларускім музеі.

ВЫСТАЎКА жывапісі, графікі і скульптуры, прысвечаная 15-годдзю выяўленчага мастацтва БССР, адкрылася ў Менску ў Доме Калгаспніка.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Да увагі дэлегатаў V Усебеларускага з'езда спажыўкааперацыі

V Усебеларускі з'езд спажывецкайкааперацыі
назначаны на 15 лютага,
ПЕРАНОСІЦЦА на 18-га лютага
ў 6 гадзін веч., у клубе Харчавікоў імя Сталіна
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Справаздача праўлення БКС (дакл. т. Цаповак).
2. Справаздача рэўкамісіі (дакл. т. Сіманоўскі).
3. Аб рабоце сельпо (дакл. т. Бунацін).
4. Аб вырабу тавараў шырэйшаму і палепшанні якасці (дакл. Наркомцяжпром, Наркомлегпром, Наркомснаб, Наркомлес, Белсампромсовет).
5. Аб ходзе закупкі хлеба (дакл. тав. Шлейфер).
6. Выбары: а) праўлення БКС; б) рэўкамісіі; в) дэлегатаў на ўсесаюзны з'езд.
Пасяджэнне фракцыі ў 5 гадзін веч. там-жа.
Мандаты выдаюцца 17 лютага з 11 гадз. раніцы ў клубе імя Сталіна.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РАЙУПОЎКАМЗАГ СНК
ПА ПЫТАННЯХ
абавязковай пастаўкі хлеба і бульбы ў 1934 г.
скліканая
19-га ЛЮТАГА г. г. у гор. МЕНСКУ, у Доме ўрада.
На нараду павінны прыбыць райупоўкамзагі СНК усіх раёнаў БССР і нам. старшыні РВК па загатоўках па асобнаму запрошэнню, Мінскаму, Наваўлянскаму, Тураўскаму і Дальнічанскаму раёнам, мэтаю на руках.
НАСТУПНЫЯ ПАТЭРЫЯЛЫ:
1. План сеўбы і выканання азімых па сельсоветах і сектарах.
2. Даведзены план сеўбы яравых, зернавых і бульбы па сельсоветах, сектарах і культурах.
3. Мерапрыемствы раёнаў па дыферэнцыраванай норме здачы па асобных сельсоветах раёна.
Упоўкамзаг СНК СССР па БССР САДКІН.

Менск, друкарня «Звязды».

Упаўн. Галоўлітбела № К—2425.